РАМАНТЫКА ТВОРЧАГА ПОШУКУ

Дарагія сябры!

Віншую вас са знамянальнай датай у гісторыі маладзёжнага руху — 95-годдзем ВЛКСМ.

Для многіх нашых суайчыннікаў назаўсёды застануцца ў памяці гады камсамольскага юнацтва, авеяныя рамантыкай творчых пошукаў, энтузіязмам стваральнай працы і імкненнем будаваць сучаснасць і будучыню сваёй Радзімы.

Гістарычны шлях Саюза моладзі адзначаны яркімі здзяйсненнямі ў перыяд будаўніцтва прамысловых гігантаў першых пяцігодак, гераізмам на франтах Вялікай Айчыннай вайны, актыўным удзелам у аднаўленні разбураных гарадоў і вёсак, асваенні цаліны, раёнаў Крайняй Поўначы, Далёкага Усходу і Сібіры.

У нашай краіне цудоўныя традыцыі камсамольскага руху прадаўжае Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі. Гэта масавая грамадская арганізацыя, прыцягваючы ў свае рады лепшых прадстаўнікоў маладога пакалення, становіцца для іх добрай школай выхавання грамадзянскай адказнасці, ініцыятарам добрых пачынанняў і выразнікам інтарэсаў усіх юнакоў і дзяўчат.

Паважаныя ветэраны камсамола! Шчыра ўдзячны вам за захаванне пераемнасці і за дабратворны ўплыў, які вы аказваеце на моладзь. Няхай гэты юбілей стане значнай вяхой ва ўмацаванні нашага маладзёжнага руху, прымнажэнні яго слаўных спраў. Жадаю вам здароўя, аптымізму, шчасця, творчай энергіі і новых перамог у імя працвітання роднай Беларусі.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

29 КАСТРЫЧНІКА 2013 г. АЎТОРАК № 204 (27569) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАЦІКАЎЛЕНАСЦЬ У КАНСТРУКТЫЎНЫМ СУПРАЦОЎНІЦТВЕ

План сумесных дзеянняў урада і Нацбанка па структурным рэфармаванні і павышэнні канкурэнтаздольнасці эканомікі Беларусі, зацверджаны ў кастрычніку гэтага года, можа стаць асновай для новай праграмы Міжнароднага валютнага фонду (МВФ) з Беларуссю. Такое меркаванне выказаў прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч на сустрэчы з кіраўніком місіі МВФ у Беларусі Дэвідам Хофманам, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Прэм'ер-міністр прапанаваў кіраўніку місіі разгледзець механізм вырашэння двух даволі важных пытанняў, такіх як плацежны баланс і рэзервы. «Гэта значыць, на якія крокі фонду можа разлічваць Беларусь у рамках пятага артыкула статута МВФ, згодна з якім кожная дзяржава — удзельнік фонду можа разлічваць на атрыманне дапамогі ў вырашэнні праблем плацежнага балансу і рэзерваў. Прычым на прынцыпах недыскрымінацыйнасці», — удакладніў ён. Паводле слоў кіраўніка беларускага ўрада, цяпер у эканоміцы Беларусі менавіта такая сітуацыя, калі актуальны разгляд сумесных мер у рамках гэтага артыкула статута.

У цэлым Міхаіл Мясніковіч адзначыў, што ўрад зацікаўлены ў канструктыўным супрацоўніцтве з фондам.

«Калі гаварыць аб некаторых пытаннях развіцця беларускай эканомікі на сучасным этапе, то мы прытрымліваемся той матрыцы, якая была адпрацавана з Антыкрызісным фондам ЕўрАзЭС. Гэта была наша ўзаемная дамоўленасць з Расіяй і Казахстанам, і мы імкнёмся дзейнічаць у рамках тых параметраў, якія былі вызначаны адпаведнай праграмай з АКФ», — падкрэсліў прэм'-ер-міністр.

Акрамя таго, дадаў ён, урад і Нацыянальны банк Беларусі прынялі план сістэмных і структурных пераўтварэнняў, які быў прадстаўлены місіі. «На наш погляд, гэта тая база, на аснове якой могуць будавацца падыходы па новай праграме МВФ з Беларуссю», — лічыць Міхаіл Мясніковіч.

Беларусь рэалізавала праграму стэнд-бай, падтрыманую крэдытам МВФ на $3,5 млрд, у перыяд са студзеня 2009 па красавік 2010 года. Гэта дало магчымасць краіне забяспечыць дадатную дынаміку па шэрагу пазіцый у эканоміцы і грашова-крэдытнай сферы. На 2013 год прыпадае пік выплат па крэдыце. З 17 па 28 красавіка ў Мінску знаходзіцца місія супрацоўнікаў Міжнароднага валютнага фонду, якую ўзначальвае Дэвід Хофман, для правядзення пятага постпраграмнага маніторынгу беларускай эканомікі.

Міжнародны валютны фонд — спецыялізаваная ўстанова ААН са штаб-кватэрай у Вашынгтоне (ЗША). Афіцыйная дата стварэння МВФ — 27 снежня 1945 года. Беларусь з'яўляецца членам МВФ з 1992 года. Дзейнасць МВФ у Беларусі накіравана на супрацоўніцтва з урадам і Нацыянальным банкам пры падрыхтоўцы праграм эканамічнай палітыкі з акцэнтам на падаткова-бюджэтную і грашова-крэдытную палітыку, абменны курс і гандлёвую палітыку з мэтай дасягнення значнага эканамічнага росту, нізкай інфляцыі і ўстойлівасці плацежнага балансу.

З 1992 па 2008 год Беларусь двойчы выкарыстоўвала фінансавыя рэсурсы МВФ: па лініі фонду сістэмных трансфармацый — $217,2 млн і па механізме стэнд-бай — $77,4 млн. У лютым 2005 года Беларусь цалкам пагасіла названыя крэдыты МВФ.

■ Фінансавая «навінка»

РУБЛЁВЫ ДЭПАЗІТ «ПРЫВЯЗАЛІ» ДА ВАЛЮТЫ

Упершыню буйнейшы банк Беларусі прапануе насельніцтву эксклюзіўны фінансавы прадукт — уклад у беларускіх рублях «Гарант», які забяспечвае стабільны ўзровень даходнасці, незалежна ад змены курсу долара, паведамілі рэдакцыі ў прэс-службе Беларусбанка.

Такім чынам, даход па ўкладзе «Гарант» складаецца з асноўнага даходу — працэнтнай стаўкі ў памеры 10, 12 ці 15%, а таксама дадатковага даходу, які ўсталёўваецца ў працэнтах гадавых у залежнасці ад змены курсу долара.

Асноўны даход можа выплачвацца як штомесяц, так і ў канцы тэрміну. Дадатковы даход выплачваецца пры надыходзе тэрміну вяртання ўкладу. Уклад можа быць адкрыты на любы тэрмін па вашым выбары — 3, 6 ці 12 месяцаў. Уклад не прадугледжвае расходныя аперацыі і дадатковыя ўзносы. Мінімальная сума ўкладу складае 10 млн рублёў.

Пры размяшчэнні сродкаў у беларускіх рублях банк гарантуе клієнтам атрыманне дадатковага даходу, які забяспечыць вяртанне ўкладзеных збераженняў у беларускіх рублях, эквівалентных суме долараў на дату адкрыцця ўкладу, плюс асноўны працэнтны даход.

Сяргей КУРКАЧ.

Фота БЕЛТА.

КАНІКУЛЫ ПА ІНТАРЭСАХ

Вольны час школьнікаў у канікулярны час уключае розныя формы адукацыйнай, творчай, спартыўнай, працоўнай, прафарыентацыйнай дзейнасці. У перыяд восеньскіх канікул у Цэнтры дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Ранак» Маскоўскага раёна Мінска працуюць розныя аб'яднанні па інтарэсах, праводзяцца пазнавальныя, забаўляльныя і конкурсныя мерапрыемствы для гарадскіх аздараўленчых лагераў. Арганізаваны экскурсіі ў музеі Цэнтра. 500 хлопчыкаў і дзяўчынак пабываюць у музеі баявой славы і музеі гісторыі пажарнай справы «Скрозь полымя гадоў». У цэнтры працуюць 512 гурткоў. У перыяд канікул арганізавана праца гарадскога аздараўленчага лагера для навучэнцаў Цэнтра.

САЮЗНЫ ТУРНІР ІНТЭЛЕКТУАЛАЎ

Заключны этап алімпіяды школьнікаў Саюзнай дзяржавы «Расія і Беларусь»: гістарычнае і духоўнае адзінства» стартаваў у Полацку 27 кастрычніка.

Удзел у заключным туры алімпіяды возьмуць 180 беларускіх і расійскіх школьнікаў — вучні 9—11-х класаў. Беларусь прадставяць 8 каманд — з усіх абласцей, сталіцы, і асобная каманда — з Ліцэя БДУ. У кожную каманду ўваходзіць 6 чалавек.

Заключны этап алімпіяды складаецца з двух тураў — асноўнага і творчага. Асноўны тур — абавязковы для ўсіх удзельнікаў. Падчас гэтага тура школьнікі выконваюць пісьмовыя заданні: пішуць сачыненне і комплексную работу па рускай мове і літаратуры. Ахвотныя могуць прыняць удзел яшчэ і ў творчым туры, дзе вызначаюцца пераможцы ў рытарычным майстэрстве, выразным чытанні, а таксама знаўцы гісторыі. Ацэньваць здольнасці школьнікаў будзе журы, у склад якога ўвайшлі вядомыя беларускія і расійскія навукоўцы, вядучыя выкладчыкі ВНУ і настаўнікі-практыкі. Таксама для ўдзельнікаў алімпіяды запланавана вялікая культурная і экскурсійная праграма.

Пераможцаў алімпіяды чакаюць спецыяльныя дыпломы, каштоўныя прызы і падарункі. Астатнія школьнікі атрымаюць дыпломы ўдзельнікаў і сувеніры. Таксама плануецца выдаць зборнік лепшых работ.

Алімпіяда школьнікаў «Расія і Беларусь: гістарычнае і духоўнае адзінства» праводзіцца з 2004 года. Яе арганізатары — Міністэрства адукацыі нашай краіны і Міністэрства адукацыі і навукі Расійскай Федэрацыі. Фінансаванне ажыццяўляецца з бюджэту Саюзнай дзяржавы.

Беларускія школьнікі, якія перамагаюць на алімпіядзе, атрымліваюць права прыярытэтнага паступлення на філалагічныя спецыяльнасці ў расійскія і беларускія ВНУ. У 2012 годзе абсалютным пераможцам алімпіяды «Беларусь—Расія: гістарычная і духоўная еднасць» стала навучэнка гомельскай гімназіі № 14 Вольга Нянашава, якая набрала максімальную колькасць балаў, значна апярэдзіўшы ўсіх удзельнікаў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Фота БЕЛТА.

ДОБРАЕ МЕСЦА НА ВОСЕНЬ ЖЫЦЦЯ

Ці хутка беларускія пенсіянеры змогуць жыць на камфортных і ўтульных «вілах»?

Большасць сем'яў імкнуцца самі клапаціцца пра сваіх састарэлых бацькоў. Але, пакідаючы іх адных дома, пакуль самі знаходзяцца на працы, трывожацца: як там яны адны? Ці змогуць падагрэць абед, ці не забудуць выключыць пліту? Для часткі з іх праблема цяпер вырашана: учора ў Мінску ў Фрунзенскім раёне адкрылася першае аддзяленне дзённага знаходжання для пажылых. Цяпер старых бацькоў можна будзе пакінуць там, як у дзіцячым садку, а ўвечары забраць дадому.

Дзеці на працу, а пажылыя бацькі — у «дзіцячы сад»

— У аддзяленне мы будзем браць людзей пенсійнага ўзросту, тых, хто мае патрэбу ў доглядзе і па стане здароўя не можа знаходзіцца дома адзін, — кажа **намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Ірына ДУДКА**. — Іх дзеці, як правіла, працуюць. І для таго, каб яны не былі вымушаны змяшчаць бацькоў у дом-інтэрнат альбо кідаць працу, каб пажылы чалавек жыў побач са сваякамі, у родных сценах, і ствараюцца такія аддзяленні.

СТАР 3

ЗІМОВЫ РАСКЛАД "БЕЛАВІЯ"

Рэкордных у айчыннай практыцы вынікаў дабілася ў гэтым годзе Нацыянальная авіякампанія "Белавія".

Колькасць перавезеных пасажыраў:

за суткі 9 571

за месяц 1 — больш як 200 тыс.

за 9 месяцаў 1 2 3 4 5 6 7 8 9 — 1 304,4 тыс.

Час дзеяння зімовага раскладу:

27 кастрычніка 2013 года - 29 сакавіка 2014 года

Новае ў зімовым раскладзе:

- выкананне рэйсаў у Астану да 5 разоў у тыдзень
- выкананне рэйсаў у Жэневу 3 разы ў тыдзень
- выкананне рэйсаў у Тбілісі да 10 разоў у тыдзень
- выкананне рэйсаў у Сочы 2 разы ў тыдзень*

У гэтым зімовым сезоне ў параўнанні з мінулагоднім будзе таксама павялічана частата рэйсаў з Мінска ў Ерэван, Калінінград, Кіеў, Маскву, Прагу, Рыгу, Стамбул і Франкфурт.

У перыяд навагодніх свят у Парыж і Барселону плануецца выканаць па 8 дадатковых рэйсаў, а ў Маскву, Прагу, Жэневу, Тбілісі, Баку, Ерэван, Рым, Мілан задзейнічаць паветраныя судны большай умяшчальнасці.

**У лютым напярэдадні і ў час правядзення зімовых Алімпійскіх гульняў колькасць палётаў у Сочы будзе павялічана да 3 разоў у тыдзень.*

Крыніца: Нацыянальная авіякампанія "Белавія". © Інфаграфіка БЕЛТА

ЛІЧБА ДНЯ

9 млн 465,5 тыс. чалавек

склала колькасць насельніцтва Беларусі на 1 кастрычніка гэтага года. Натуральнае змяншэнне насельніцтва сёлета ў студзені—верасні знізілася ў параўнанні з адпаведным перыядам 2012 года на 28% і склала 6 тыс. 247 чалавек. Міграцыйны прырост за студзень—верасень склаў 7 тыс. 869 чалавек (узрос у параўнанні з аналагічным перыядам 2012 года на 1 тыс. 750 чалавек, або на 28,6 %) і кампенсаваў натуральнае змяншэнне насельніцтва, забяспечыўшы павелічэнне яго колькасці. Паводле аператыўных даных, у студзені—верасні гэтага года ў рэспубліцы нарадзілася 87 тыс. 917 дзяцей, памерлі — 94 тыс. 164 чалавекі.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 29.10.2013 г.

Долар ЗША	9180,00	▲
Еўра	12670,00	■
Рас. руб.	288,50	▼
Укр. грыўня	1121,56	▼

■ Надвор'е

З СЕРАДЫ ПАЧНЕ СВАЖЭЦЬ...

У аўторак на тэрыторыі нашай краіны захаваецца цёплае надвор'е, калі пры павышаным атмасферным ціску дажджоў не прадбачыцца, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.

Разам з тым месцамі чакаецца узмацненне паўднёва-заходняга ветру, у паўночных рэгіёнах краіны парывамі да 15-18 м/с. Максімальная тэмпература паветра ўдзень 12-17 цяпла, у Брэсцкай і Гомельскай абласцях — да плюс 19 градусаў. Аднак ужо ў сераду атмасферныя франты прынясуць кароткачасовыя дажджы ўначы ў паўднёва-заходнія раёны, а ўдзень — і ў паўднёва-ўсходнюю палову Беларусі. Раніцай і ўначы слабы туман. Пасвяжэе. Тэмпература паветра ўначы на сераду плюс 4-10 градусаў (толькі па поўдні да плюс 12), удзень 8-14 цяпла.

У апошні дзень месяца атмасферны ціск будзе павялічвацца, таму істотных ападкаў ужо не будзе. Толькі ўначы па паўднёвым ўсходзе кароткачасовыя дажджы. Раніцай і ўначы ў асобных раёнах туман. Уначы на чацвер тэмпература паветра знізіцца да плюс 2-8 градусаў, удзень — 7-13 цяпла. Не прагназуецца істотных ападкаў і ў пятніцу. Раніцай месцамі туман. Тэмпература ўначы стане ўжо ад 0 да плюс 6 градусаў, удзень — 7-13 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ГРУЗІЯ АБРАЛА ПРЭЗІДЭНТА

Кандыдат ад кіруючай кааліцыі «Грузінская мара» Георгій Маргвелашвілі перамог на выбарах прэзідэнта Грузіі. Па выніках падліку 99,68 працэнта бюлетэняў ён набраў 62,12 працэнта галасоў выбаршчыкаў. Як паведаміла прэс-сакратар ЦВК Грузіі Эка Азарашвілі, гэта практычна канчатковыя звесткі, і нічога ўжо не зменіцца. Бліжэйшыя апаненты Маргвелашвілі — кандыдат ад партыі Міхаіла Саакашвілі «Адзіны нацыянальны рух» Давід Бакрадзэ і былы спікер парламента Ніно Бурджанадзэ набралі 21,72 і 10,18 працэнта галасоў адпаведна. Яўка на выбарах склала 46,91 працэнта. Паводле звестак прэс-сакратара Цэнтрвыбаркама, сур'ёзных парушэнняў падчас галасавання зафіксавана не было. Усяго за прэзідэнцкае крэсла змагаліся 23 чалавекі.

ЗЛУЧАНЫЯ ШТАТЫ ПАЧЫНАЮЦЬ УСТАЛЁЎВАЦЬ СІСТЭМУ ПРА Ў РУМЫНІІ

На базе ў Дэвеселу на поўдні Румыніі ў панядзелак стартавалі работы па размяшчэнні супрацьракетнага комплексу як часткі створанай Злучанымі Штатамі і НАТА еўрапейскай супрацьракетнай абароны. Для ўдзелу ў цырымоніі пачатку разгортвання сістэмы ПРА ў Румынію прыбылі намеснік міністра абароны ЗША па палітычных справах Джэймс Мілер і шэраг высокапастаўленых прадстаўнікоў краін — членаў НАТА. Расія тым часам зноў заклікала Злучаныя Штаты і НАТА паспрабаваць разам выйсці з тупіка ў сувязі з абмеркаваннем праблемы ПРА, якая з'яўляецца ключавой у росце напружанасці ў адносінах паміж Масквой і Вашынгтонам. Але ў той жа час Маскву не задавальняюць толькі размовы ЗША і НАТА аб ненакіраванасці еўрапейскай ПРА супраць Расіі. Гэтую тэму падняў у панядзелак міністр замежных спраў РФ Сяргей Лаўроў, выступаючы на 8-м пасяджэнні расійска-ўкраінскага падкамітэта па міжнародным супрацоўніцтве.

АМЕРЫКАНЕЦ НЕ ЗМОГ АДМЯНІЦЬ РАШЭННЕ СУДА АБ СВАЁЙ СМЕРЦІ

У штаце Агаё мужчына, які звярнуўся ў суд з патрабаваннем адмяніць пастанову аб сваёй смерці, застаўся юрыдычна «мёртвым». Суддзя акругі Хэнкок Алан Дэвіс, які абвясціў Дональда Юджына Мілера-малодшага мёртвым у 1994 годзе пасля таго, як той восем гадоў лічыўся без вестак прапаўшым, аб'явіў, што тэрмін даўнасці для адмены гэтага рашэння даўно мінуў. Ён адзначыў, што, згодна з законам штата, пастанову аб смерці можна адмяніць толькі на працягу трох гадоў пасля яе прыняцця. Паводле слоў Мілера, ён уцёк з дому 27 гадоў таму з-за таго, што шмат піў і страціў працу. Мёртвым яго аб'явілі па звароце яго былой жонкі Робін. За восем гадоў сваёй адсутнасці ён не выплачваў аліменты, і такім чынам яна збіралася дамагчыся права на сацыяльную дапамогу для дзяцей.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

«СВЯТЫ ІУДА» АБРЫНУЎСЯ НА ВЯЛІКАБРЫТАНІЮ, НІДЭРЛАНДЫ І ФРАНЦЫЮ

Магутны ўраган, які атрымаў імя святога Іуды, абрынуўся ўчора раніцай на паўднёвыя раёны Вялікабрытаніі, а таксама на паўночны захад Францыі, перадаюць інфармагенцтвы. Хуткасць ветру на ўзбярэжжы Паўднёвай Англіі дасягала 120 км/г. У шэрагу рэгіёнаў перакрыты аўтамабільныя дарогі, на маршруты не выйшлі цягнікі. У лонданскім аэрапорце Хітроў адменены сотні рэйсаў. У Лондане будаўнічы кран упаў на будынак сакратарыята кабінета міністраў у Вестмінстары. Ураган ужо стаў прычынай гібелі прынамсі трох чалавек. У Вялікабрытаніі 17-гадовая жыхарка Эдэнбрыджа атрымала смяротныя раненні пасля таго, як на яе ўпала дрэва. Мужчына, якому было за 50 гадоў, загінуў за рулём свайго аўтамабіля ў Хартфордшыры таксама падчас падзення дрэва, перадае ВВС.

Раней таксама стала вядома аб яшчэ адной ахвяры — 14-гадовым падлетку, якога, як мяркуецца, знесла ў мора ў мястэчку Ньюхевэн. Выратавальныя службы спрабавалі адшукаць юнака сярод хваль, але былі вымушаны адступіць, калі шторм узмацніўся. У Нідэрландах «Святы Іуда» забраў жыццё жыхаркі Амстэрдама, паведамляе агенцтва Reuters са спасылкай на прадстаўнікоў мясцовай паліцыі. На жанчыну ўпала паваленае ветрам дрэва. Яе муж, які знаходзіўся побач, дастаўлены ў бальніцу з сур'ёзнай траўмай галавы. Сіноптыкі прагназуюць, што «Святы Іуда» можа стаць самым разбуральным у Еўропе за апошнія 20 гадоў.

КАРАТКА

У Мінску будуць больш актыўна прыцягваць грамадзян да ўдзелу ў фінансаванні работ па будаўніцтве парковак.

Дырэкцыі будаўніцтва Беларускай АЭС выдадзена ліцэнзія на ўзвядзенне ядзернай установы энергаблока нумар 1.

Мера стрымання адносна Уладзіслава Баўмгертнера не змянілася — ён застаецца пад дамашнім арыштам. Тэрмін расследавання крымінальнай справы адносна Баўмгертнера працягнуты на 2 месяцы.

Беларусь прадоўжыла забарону на вываз неапрацаваных шкур буйной рагатай жывёлы да 20 снежня.

У Мінску прышчэплена супраць грыпу 22,3 працэнта грамадзян, што склала 423 тыс. чалавек.

Мінскае гарадское ўпраўленне МНС 29 кастрычніка правядзе вучэнні ў будынку Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь па вуліцы Маскоўскай, 17. Вучэнні пройдуць з 10.00 да 12.00.

ISSN 1990 - 763X

СТУДЭНЦКІ АТРАД — САПРАЎДНАЯ ШКОЛА ДАРОСЛАГА ЖЫЦЦЯ

Да 50-годдзя беларускага студатрадаўскага руху

Дарагія сябры!

Прыміце мае сардэчныя віншаванні з 50-гадовым юбілеем беларускага студатрадаўскага руху.

За паўстагоддзя студэнцкія атрады заваявалі вялікі аўтарытэт дзякуючы таму, што ўносяць дастойны ўклад у эканоміку і сацыяльную сферу краіны.

У летапісе іх слаўных спраў ударная праца на такіх важных будоўлях, як Наваполацкі і Мазырскі нафтаперапрацоўчыя заводы, «Гомсельмаш», рэканструкцыя мемарыяла «Хатынь», узвядзенне Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, спартыўнага комплексу «Мінск-Арэна», Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і іншых знакавых аб'ектаў.

Студэнцкі атрад і сёння для многіх юнакоў і дзяўчат становіцца сапраўднай школай даросламу жыцця, фарміруе характары актыўных грамадзян і патрыётаў сваёй Радзімы. Таму падтрымка студатрадаўскага руху з'яўляецца прыярытэтам дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі ў Беларусі.

У гэты святочны дзень маладосці і рамантыкі жадаю байцам студэнцкіх атрадаў усіх пакаленняў здароўя, шчасця і поспехаў у працы.

Няхай вашы сэрцы б'юцца ў рытме часу, а невычэрпная энергія і разуменне асабістай адказнасці за лёс сваёй краіны дапамагаюць у вырашэнні задач на карысць Айчыны.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

ДЗЯРЖАЎНАЯ ПАДТРЫМКА БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ

Больш як Br3 млрд са сродкаў фонду Прэзідэнта Беларусі будзе накіравана на фінансаванне творчых і іншых праектаў

Адпаведнае распараджэнне падпісаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

На рэстаўрацыю і музеефікацыю гісторыка-культурных каштоўнасцяў Нацыянальнаму Полацкаму гісторыка-культурнаму музею-запаведніку выдзелена Br420 млн, Нацыянальнаму гістарычнаму музею — Br118 млн.

Моладзеваму тэатру эстрады і Нацыянальнаму акадэмічнаму драматычнаму тэатру імя М. Горкага выдзяляецца адпаведна Br680 млн і Br500 млн на набыццё сцэнічнага і іншага абсталявання.

Са сродкаў фонду таксама будзе прафінансавана набыццё музычных інструментаў для народнага духавога аркестра «Віціны» на суму амаль Br200 млн.

Акрамя таго, Br950 млн выдзяляецца прыватнай тэатральна-відовішчнай установе «Цэнтр візуальных і выканальніцкіх мастацтваў «АРТ Карпарэйшэн» на арганізацыю і правядзенне XX Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад».

Літаратурнаму музею М. Багдановіча будзе накіравана Br50 млн на арганізацыю выставы «Праглядзіце гэты томік...», прысвечанай 100-годдзю з дня выхаду зборніка вершаў паэта «Вянок».

Падпісанне распараджэння будзе садзейнічаць рэалізацыі сацыяльна значных творчых праектаў, павышэнню кваліфікацыі музейных работнікаў і стане яшчэ адным сведчаннем пастаяннай дзяржаўнай падтрымкі беларускай культуры.

■ Падзея

МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ — 75 ГАДОЎ

І з гэтай нагоды ў Маладзечне, у парку імя Перамогі, пасаджана Дрэва міру, дружбы і згоды і закладзена ліпавая алея.

Вядомыя людзі Міншчыны саджаюць Дрэва міру, дружбы і згоды.

— 75-годдзе Мінскай вобласці стала знакавай падзеяй для жыхароў Міншчыны і для ўсёй Беларусі. Цэнтральны рэгіён вызначаецца не столькі сваім геаграфічным становішчам, колькі эканамічным, духоўным, культурным патэнцыялам. Са справамі жыхароў Мінскай вобласці звязаны ўсе найлепшыя дасягненні нашай краіны, — сказала ў прывітальным слове **дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі ад Маладзечанскай гарадской акругі, член Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Галіна ЛАЗОЎСКАЯ**.

У мерапрыемстве прынялі ўдзел актывісты грамадскіх, палітычных і нацыянальна-культурных аб'яднанняў, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, мнагадзетныя сем'і, залатыя юбіляры, таленавітая моладзь. На ўрачыстасці таксама прысутнічалі кіраўніцтва Мінаблвыканкама, Маладзечанскага райвыканкама, прадстаўнікі дэпутацкага корпуса.

Святлана БУСЬКО

■

САЮЗНАЯ ДЗЯРЖАВА ЯК ЛЯКАЛА

Ад дынамікі яе развіцця залежыць поспех іншых інтэграцыйных праектаў

Фота БЕЛТА.

Пра гэта ідзе размова на экспертна-медыйным форуме-семінары «Інфармацыйны вобраз Саюзнай дзяржавы», які праходзіць 28-29 кастрычніка ў Маскве на пляцоўцы агенцтва «РИА Новости».

Дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Рыгор РАПОТА нагадаў удзельнікам семінара, што Саюзная дзяржава — гэта пакуль толькі праект, які знаходзіцца ў стадыі рэалізацыі і павінен завяршыцца прыняццем Канстытуцыйнага акта.

— Гэта толькі фінальная частка нашага руху, якая тады толькі будзе мець права на жыццё, калі будуць вырашаны вельмі важныя этапы: стварэнне адзінай транспартнай і энергетычнай прасторы, узгодненай прамысловай палітыкі, адзінай сацыяльнай і інфармацыйнай палітыкі, узаемадзеянне ў міжнародных адносінах, ваенна-палітычнай сферы, — сказаў Рыгор Рапота. — Цяпер найбольш прасунутай часткай Саюзнай дзяржавы з'яўляецца сацыяльная сфера, для развіцця якой стварылі добрыя ўмовы памежнікі і мытнікі, якія максімальна спрасцілі перасячэнне расійска-беларускай мяжы, і шэраг пагадненняў, што забяспечваюць аднолькавыя правы грамадзян на тэрыторыях абедзвюх краін. Самы важны элемент любой інтэграцыйнай сістэмы — умовы, пры якіх людзі не адчуюць сябе замежнікамі на тэрыторыі партнёрскіх дзяржаў.

Дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы выказаў задаволенасць тым, як удаецца каардынаваць дзвюм краінам дзеянні ў ваеннай, навукова-тэхнічнай, гуманітарнай і культурнай сферах. Разам з тым Беларусі і Расіі не атрымліваецца пакуль дасягнуць узгодненасці ў прамысловай палітыцы, няма дастаткова ўзаемадзеяння ў правапрымальнай практыцы, невырашанымі застаюцца і пытанні ўласнасці Саюзнай дзяржавы, у тым ліку інтэлектуальнай.

Што тычыцца інфармацыйнага поля, то яно сёння нагадвае вуліцу з аднабаковым рухам, лічыць **пасол Беларусі ў Расійскай Федэрацыі Ігар ПЕТРЫШЭНКА**. У Беларусі свабодна вяшчаюць расійскія тэлеканалы, распаўсюджваюцца друкаваныя выданні, чаго нельга сказаць пра беларускія СМІ на тэрыторыі Расіі. Расіянам не толькі не хапае, на думку беларускага пасла, інфармацыі пра Беларусь, але і расійскія СМІ часам настроеныя недружалюбна ў дачыненні да нашай краіны.

— Аб праблемных пытаннях «двойкі» трэба казаць, — падкрэсліў дыпламат. — Аднак, інфармацыйная прастора не можа быць арэнай палітычных і іншых спекуляцый. Важна даносіць дакладную інфармацыю і адказна ставіцца да яе падачы.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА,
Масква.

■ Наўздагон

МІНСКІЯ САМІТЫ: чарговы поспех ці чарговы крызіс?

24-25 кастрычніка 2013 года ў сталіцы Беларусі прайшлі пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў Садружнасці Незалежных Дзяржаў і Еўразійскага вышэйшага эканамічнага савета. Кіраўнікі постсавецкіх дзяржаў сустрэліся для таго, каб абмеркаваць лёс і ход рэалізацыі самага старога і самага новага інтэграцыйных праектаў у рэгіёне.

Мерапрыемствам папярэднічалі шматлікія дыскусіі, спрэчкі, завочныя пікіроўкі прадстаўнікоў дзяржаў-удзельніц. Немалы градус супярэчнасцяў быў прадэманстраваны нават у адносінах паміж Беларуссю, Казахстанам і Расіяй. Мінулыя саміты павінны былі калі не расставіць кропкі над «і», то, прынамсі, растлумачыць сітуацыю.

Пра іх вынікі мы гаварылі з прадстаўнікамі экспертнай супольнасці ключавых дзяржаў, якія маюць дачыненне да інтэграцыйных працэсаў на постсавецкай прасторы.

Марат ШЫБУТАЎ, прадстаўнік Асацыяцыі прыгранічнага супрацоўніцтва ў Казахстане (Казахстан)

Мінулы савет у Мінску паказаў, што супярэчнасці паміж партнёрамі па інтэграцыі зусім не аслаблі. Напрыклад, прапанова Нурсултана Назарбаева пра ўключэнне Турцыі ў склад Мытнага саюза — гэта насамрэч не агучванне прапановы Анкары, але, у першую чаргу, дыпламатычны папрок Расіі за пастаянныя спробы пашырыць МС за кошт краін, якія туды ўвайсці з аб'ектыўных прычын не гатовы, напрыклад, Арменіі і Кыргызстана. Хутчэй за ўсё, для гэтых дзвюх краін у хуткім часе будуць створаны «дарожныя карты» іх далучэння да Мытнага саюза, аднак выканаць усе патрабаванні яны наўрад ці змогуць.

Іншы прыклад — прапанова Прэзідэнта Казахстана аб ліквідацыі ЕўрАзЭС. Яна адлюстроўвае прэтэнзіі Астаны з нагоды невыканання ўжо зацверджаных пагадненняў, якія ляжаць у аснове МС і АЭП. Таму што існаванне ЕўрАзЭС спрыяе прадастаўленню краінам, якія не ўваходзяць у Мытны саюз, ільгот, што дазваляюць ім атрымліваць перавагі ўжо ў рамках Мытнага саюза, не несучы пры гэтым ніякіх абавязацельстваў.

Такі ж сэнс маюць і словы Аляксандра Лукашэнкі аб неабходнасці ліквідацыі ўсіх выключэнняў паміж удзельнікамі еўразійскай інтэграцыі. Пра гэта таксама кажа кіраўнік Казахстана, бо Расія вераломна ўводзіць усё новыя нетарыфныя абмежаванні на пастаўкі прадукцыі з краін МС у абыход усіх дзейных дамоўленасцяў. Напрыклад, перад самым саветам прэм'ер-міністр РФ Дзмітрый Мядзведзеў даручыў абмежаваць увоз фізічнымі асобамі алкаголю з краін МС — і гэта ўжо не кажучы пра тое, што казахстанскі алкаголь ужо 3 гады не можа легальна трапіць на рынак Расіі.

Адным словам, Беларусь і Казахстан просяць Расію спачатку вырашыць праблемы ў цяперашнім складзе ўдзельнікаў, давесці інтэграцыю да лагічнага канца і толькі потым ужо далучаць новых членаў. І прапановы аб запрашэнні новых удзельнікаў у МС — гэта хутчэй спосаб агучыць папрок партнёрам, а не рэалістычныя планы па пашырэнні фармату інтэграцыі.

За такой пазіцыяй бакоў стаяць канкрэтныя надзённыя праблемы. Казахстанскія вытворцы сутыкаюцца са шматлікімі штучнымі абмежаваннямі доступу на расійскі рынак. Як і беларускія, зрэшты. Гаворка ідзе пра фітасанітарныя меры, нядаўняе увядзенне ўтылізацыйнага збору, які не спаганяецца з расійскіх аўтамабіляў, і гэтак далей.

Складваецца ўражанне, што еўразійская інтэграцыя для Масквы — гэта ідэалагічны праект пашырэння сваёй сферы ўплыву, а выконваць свае абавязацельствы ў рамках інтэграцыйных утварэнняў яна мае намер толькі ў выпадку ціску партнёраў. Як відаць, Уладзімір Пуцін паабяцаў, што ўсе праблемы будуць вырашацца, але наколькі гэта акажацца праўдай — пакажа час.

Юрый КРУПНОЎ, старшыня Руху развіцця, кіраўнік Інстытута дэмаграфіі, міграцыі і рэгіянальнага развіцця (Расія)

Працэс еўразійскай інтэграцыі знаходзіцца ў глыбокім крызісе. Гэта пагаршаецца эканамічнай сітуацыяй, якая час ад часу становіцца ўсё больш неспрыяльнай. Таму па інэрцыі, аўтаматычна не варта чакаць ад гэтага працэсу чагосьці добрага.

Не толькі пад геапалітычным ціскам, але і з унутраных прычын постсавецкая прастора працягвае расколвацца і дэзынтэгравацца. Гэты працэс можа быць пераадолены выключна праз вылучэнне новага парадку еўразійскай інтэграцыі, у аснове якога павінны ляжаць праекты сумеснага развіцця, выхад на стварэнне новых кааператыўных прадукцыйных ланцужкоў у рамках новай індустрыялізацыі.

Існуючую ж блытаніну ў еўразійскай інтэграцыі адлюстроўваюць вылучаныя Казахстанам і Расіяй прапановы аб пашырэнні Мытнага саюза за кошт Індыі і Турцыі. Дарэчы, прапанова Нурсултана Назарбаева ў гэтым сэнсе больш лагічная, паколькі, на думку шэрагу аналітыкаў, асноўным бенефіцыярам Мытнага саюза стала Турцыя. Праз тэрыторыю Казахстана яна атрымала доступ да адзінага рынку МС. Гэта паказвае, што еўразійская інтэграцыя прасоўваецца з вынікамі, невядомымі для яе ініцыятараў. І цалкам магчыма, што галоўнымі бенефіцыярамі працэсу стануць Турцыя ці іншыя замежныя дзяржавы.

Гэта азначае, што пакуль праект носіць ідэалагічны характар. Ідэя пра тое, што ліквідацыя мытных бар'ераў будзе мець станоўчы эканамічны эфект, працуе толькі тады, калі эканоміка і так расце. Гэта значыць, у нашым выпадку, калі растуць цэны на вуглевадароды. А ў нас цяпер сітуацыя прама супрацьлеглая. Цэны стагнуюць, ідзе ўнутраная дэвальвацыя, эканамічны крызіс нарастае і гэтак далей. Адсюль ліквідацыя бар'ераў не дае станоўчага эфекту, а дае нечаканыя выгады для знешніх гульцоў.

Такім чынам, ва ўмовах дэстабілізацыі міжнародных адносін Мытны саюз не стварае ачага стабільнасці. Рост нестабільнасці ў цэлым узмацняе хаос і на постсавецкай прасторы. Таму сёння тэрмінова неабходны канкрэтны праект, які звязвае ўсе базавыя эканамічныя адносіны нашых краін на доўгатэрміновы перыяд.

Юрый РАМАНЕНКА, дырэктар Цэнтра палітычнага аналізу «Стратагема» (Украіна)

Што б сёння ні казалі пра магчымыя страты Украіны ў гандлі з краінамі Мытнага саюза ў выніку яе асацыяцыі з Еўрасаюзам, гэтая аргументацыя ў значнай ступені ўжо не працуе. Таму што ва ўкраінскай эліты ёсць іншыя матывацыі: гэта яе фінансавыя інтарэсы, звязаныя з заходнімі банкамі; гэта той факт, што ў апошнія гады значна павялічаны экспарт сельскагаспадарчай прадукцыі ў краіны Еўрасаюза і сумежныя рынкі. Ёсць вялікая залежнасць ад еўрапейскага імпарту, на якім ва Украіне многія зарабілі мільёны еўра. Гэтыя і іншыя фактары штурхаюць украінскую эліту да таго, каб заключыць дагавор аб асацыяцыі, і ніякія іншыя аргументы тут ужо не будуць працаваць.

Натуральна, Украіна панясе некаторыя выдаткі ў сувязі з гэтым рашэннем, але катастрафічнага, апакаліптычнага размаху яны не будуць мець. Бо, па-першае, наўрад ці Расія і іншыя краіны МС будуць знішчаць свае галіны, завязаныя на кааперацыю з Украінай. Напрыклад, у Расіі падтрыманне дзеяздольнасці ракетных войскаў стратэгічнага прызначэння шмат у чым завязана на супрацоўніцтва з украінскімі ракетчыкамі. Па-другое, наўрад ці Расія будзе губіць свае бізнес-партнёраў ва Украіне, закрываючы межы цалкам, бо такім чынам яна разбурыць бізнес тых, хто мог бы быць яе лабістамі ва Украіне.

На працягу апошніх двух тыдняў ужо назіраецца некаторае змякчэнне тону з боку расійскіх калег. Думаю, гэтая тэндэнцыя працягнецца і сітуацыя будзе вырашана ў прагматычным ключы.

З боку ж Бруселя зацікаўленасць у інтэграцыі Украіны мае стратэгічны характар і з'яўляецца нязменнай. Ёсць доўгатэрміновыя інтарэсы, у рамках якіх вельмі многія еўрапейскія палітыкі на карту паставілі сваю кар'еру — гэта Фюле, Меркель, Квасьнеўскі, Кокс і іншыя. Цяжка дапусціць, што, выдаткаваўшы столькі часу на перамовы і падрыхтоўку рашэння, яны раптам яго зменяць на супрацьлеглае.

Ці памянялася матывацыя Еўрасаюза ў дачыненні да Украіны? Не, яна не змянілася. Еўрасаюзу патрэбна Украіна — як эканамічная пляцоўка; як тэрыторыя, з пункту гледжання бяспекі; патрэбна як крыніца дэмаграфічнай сілы, якая ёсць ва Украіне і якая можа ісці ў Еўропу, асімілюючыся лепш, чым выхадцы з арабскіх і іншых далёкіх краін.

Іншымі словамі, ЕС па-ранейшаму ўсімі праўдамі і няпраўдамі спрабуе ўцягнуць Украіну ў інтэграцыю.

РОЛЯ ТУРЦЫІ Ў ЕЎРАЗІЙСКАЙ ІНТЭГРАЦЫІ

Саміт СНД і пасяджэнне Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета, якія прайшлі ў Мінску, сталі крыніцай некалькіх сенсацый. У галіне міжнародных адносін статус адной з найбольш значных сусветнай прэсай быў нададзены навіне аб патэнцыйным удзеле Турцыі ў працэсах еўразійскай інтэграцыі. Прэзідэнт Казахстана заявіў з гэтай нагоды наступнае: «Прэм'ер-міністр Турцыі Эрдаган звярнуўся да мяне: ці нельга Турцыю прыняць у Мытны саюз?». Нурсултан Назарбаеў таксама ўнёс і сваю прапанову ў сувязі з гэтым: «Турцыя — вялікая краіна, у нас ёсць агульная мяжа. І адпала б крытыка. Куды на Захад ні паедзеш, адразу задаюць пытанне: вы ствараеце Савецкі Саюз або нешта там ствараеце пад Расію? І прыходзіцца тлумачыць, што нічога падобнага няма... Можа, Турцыю прыняць — і пытанні закончацца?»

Вядома, у сувязі з гэтай прапановай лідара Казахстана рэзонна разгледзець, ці з'яўляецца такая магчымасць не гіпатэтычнай, а практычнай. Адразу ж можна адзначыць, што падставы для ўваходжання Турцыі ў Мытны саюз маюцца дастаткова важкія. Улічваючы памер і патэнцыял турэцкай эканомікі, яна можа сапраўды стаць каштоўным членам МС.

У Турцыі мала ўласных прыродных рэсурсаў, і ў той жа час дастаткова развітая перапрацоўчая прамысловасць. Выходзячы з гэтага, прамы доступ да сыравіны Расіі і Казахстана можа стаць сур'ёзным выйгрышам для турэцкай эканомікі. Што датычыцца Расіі, Беларусі і Казахстана, то ім можа быць цікавы сур'ёзны вопыт мадэрнізацыі ўласнай эканомікі, назапашаны Турцыяй у папярэднія дзесяцігоддзі, які можа адаптавацца пры дапамозе турэцкіх бізнесменаў у еўразійскай прасторы. Ёсць у эканоміцы Турцыі і сур'ёзныя фінансавыя рэсурсы, частка з якіх таксама можа знайсці прастору для прыкладання ў рамках Мытнага саюза.

У той жа час ёсць і сур'ёзныя праблемы на шляху інтэграцыі Турцыі ў Мытны саюз. Першай з іх з'яўляецца членства гэтай краіны ў НАТА. Пры ўсёй знешняй дружалюбнай рыторыцы з боку НАТА ў дачыненні да краін, якія ўдзельнічаюць у еўразійскай інтэграцыі, трывалай дружбы неяк не атрымліваецца. А Турцыя наўрад ці ў бліжэйшыя гады гатова будзе выйсці з гэтага блока, звязваючы з членствам у ім сваё асаблівае становішча ў Азіі і абапіраючыся на НАТА ў дасягненні рэгіянальнага лідарства. Другая праблема — Зона свабоднага гандлю (ЗСГ) з Еўрасаюзам, якая існуе ў Турцыі. Яе правілы значна адрозніваюцца ад тых, што існуюць у Мытным саюзе, таму тут, як і ў выпадку з Украінай, неабходна выбіраць. А паколькі Турцыя з'яўляецца адной з нешматлікіх краін, якія здолелі выйграць ад усталявання ЗСГ з ЕС, яна наўрад ці паспяшаецца адмаўляцца ад таго, што ўжо паспяхова працуе, на карысць новага праекта, вынікі ўдзелу ў якім яшчэ невядомыя. Трэцяй праблемай з'яўляецца тое, што Турцыя ўвайшла ў СГА на ўмовах, якія сур'ёзна адрозніваюцца ад тых, на якіх стала членам гэтай арганізацыі Расія. Гэта азначае, што адной з краін давядзецца весці перамовы аб значным змяненні ўмоў свайго членства ў СГА ў тым выпадку, калі пачнуцца рэальныя перамовы аб уступленні Турцыі ў МС. А ўлічваючы тое, што ў абодвух выпадках будзе існаваць сур'ёзная рэўнасць з боку краін ЕС да перспектывы ўваходжання Турцыі ў канкурэнтны Еўрасаюзу інтэграцыйны праект, такія перамовы можна будзе без усякага поспеху весці гадамі. Тым больш што чарговы этап перамоў аб уступленні Турцыі ў Еўрапейскі саюз пачнецца ўжо 5 лістапада, і, нягледзячы на тое, што, на думку большасці палітолагаў, Турцыя не мае рэальных шанцаў стаць членам гэтай арганізацыі, частка турэцкіх эліт прагне рэалізацыі менавіта гэтага сцэнарыя.

У той жа час у перспектыве, калі або Турцыя выйдзе з НАТА, або будучаму Еўразійскаму эканамічнаму саюзу ўдасца палепшыць з гэтым блокам адносіны, такая інтэграцыя стане цалкам магчымай. Што да праблемы з ЗСГ з Еўрасаюзам і ўмоў членства ў СГА, то яна таксама можа вырашыцца ў будучыні, у выпадку, калі ў фармаце «інтэграцыі інтэграцый», які плануецца, пачнецца абмеркаванне ўмоў інтэграцыі еўрапейскай і еўразійскай эканамічных прастор. У гэтым выпадку турэцкія ўмовы ўдзелу ў свабодным гандлі з ЕС і ўмовы членства ў СГА будуць абмяркоўвацца паралельна на фоне ўзгаднення тых жа ўмоў краінамі еўразійскай інтэграцыі з краінамі ЕС. Але, вядома, пакуль што да рэалізацыі перспектыўнага праекта па «інтэграцыі інтэграцый» яшчэ дастаткова далёка.

У самой Турцыі прапанова Прэзідэнта Казахстана аб магчымасці ўдзелу гэтай краіны ў Мытным саюзе была ўспрынята даволі сур'ёзна. У прыватнасці, у суботу турэцкая газета Sabah са спасылкай на крыніцу ў МЗС Турцыі паведаміла чытачам, што краіна не атрымлівала афіцыйнай прапановы аб уступленні ў еўразійскі Мытны саюз. Газета таксама паказала, што яе крыніца пацвердзіла, што такога роду перамовы вяліся раней.

Сяргей КІЗІМА,
доктар палітычных навук.

НАВІНЫ

ЗРАБІЦЬ НЕЛЬГА АДПІСВАЦЬ

Пытанні, якія тычацца жылля і жыллёва-камунальнай гаспадаркі, застаюцца самымі важнымі для жыхароў Гомельшчыны. Пра гэта сведчыць аналіз зваротаў у Камітэт дзяржаўнага кантролю вобласці. 44% скаргаў прысвечаны менавіта гэтай праблематыцы.

У прэс-службе адзначаюць, што арганізацыі, ад якіх непасрэдна залежыць выпраўленне сітуацыі, часам проста не жадаюць пачуць і прыняць меры па вырашэнні праблем, якія ўзнікаюць у людзей, а займаюцца толькі адпіскамі на іх звароты. Недагляд у рабоце дзяржаўных органаў, непрыняцце своечасовых мер пацвярджаюцца вялікай колькасцю станоўча вырашаных пытанняў.

Між тым, як паказвае практыка, на вырашэнне некаторых пытанняў пасля ўмяшання спецыялістаў КДК спатрэбілася ўсяго некалькі дзён. Так, за тыдзень супрацоўнікі КЖУП «Хойніцкі камунальнік» адрамантавалі інжынерныя сеткі ў падвальным памяшканні і асушылі яго, а таксама добраўпарадкавалі тэрыторыю каналізацыйна-помпавай станцыі. Добрушскаму райвыканкаму спатрэбілася некалькі дзён для таго, каб абрэзаць аварыйныя дрэвы. Аддзел адукацыі Буда-Кашалёўскага райвыканкама за некалькі дзён арганізаваў падвоз дзяцей у школу. Тыдзень спатрэбіўся для падключэння да электрасеткі дома ў гарадскім пасёлку Карма, святло ў якім адсутнічала на працягу двух гадоў — з моманту выдзялення кватэр грамадзянам.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

НЕДАКУРАК МОГ ПРЫВЕСЦІ ДА ТРАГЕДЫІ

Кінуты з балкона недакурак ледзь не стаў прычынай гібелі дзіцяці ў горадзе Беразіно.

Выратавальнікам паступіў выклік: з балкона на чацвёртым паверсе пяціпавярховага жылога дома ідзе дым, у кватэры знаходзіцца дзіця...

— У жыллі знаходзілася 9-гадовая дзяўчынка, якая з-за хваробы не пайшла ў школу. Выйсці з кватэры яна не магла, бо на дзвярах быў устаноўлены замок без унутранай зашчапкі, — паведамілі ў Мінскім абласным упраўленні МНС. — Выратавальнікі папрасілі дзяўчынку легчы на падлогу, а самі ўскрывалі ўваходныя металічныя дзверы пры дапамозе бензарэза. Потым дзіця вынеслі на свежае паветра і перадалі медыкам. Мяркуецца, што прычынай здарэння стаў кінуты з вышэй размешчанага паверха недакурак.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПАДЗЕІ

ЦЫГАРЭТЫ ЗНОЎ ПАДАРАЖЭЮЦЬ

Як вядома, з пачатку мінулага года вытворцы і імпарцёры цыгарэт маюць права штомесяц дэкларацыраваць максімальныя рознічныя цэны на гэты тавар. І, трэба сказаць, апошнім часам рэдка «прапускаюць» такую магчымасць. Напрыклад, апошняе павелічэнне было з пачатку кастрычніка — на 3,7—4,8 працэнта.

З 1 лістапада ў краіне зноў будуць павялічаны цэны на некаторыя маркі цыгарэт. Напрыклад, максімальныя рознічныя цэны на тытунёвыя вырабы вытворчасці «Гродзенскай тытунёвай фабрыкі «Нёман» вырастуць на 1,2—4,7 працэнта ў залежнасці ад маркі. Прадукцыя «Тытунь-Інвеста» падаражэе на 2,4—7,1 працэнта. А вось максімальныя рознічныя цэны на імпартныя цыгарэты павялічацца на 4,2—30,2 працэнта.

Сяргей РАСОЛЬКА.

11 ДЗЯЦЕЙ ЗАСТАЛІСЯ БЕЗ МАЦІ

З ранку ўсе сайты абляцела трагічная вестка: у Пружанах загінула Кацярына Онахава, маці 11-ці дзяцей, двое з якіх біялагічныя, а 9 — прыёмныя.

Кацярыну і яе мужа, як падзвіжнікаў справы выхавання дзяцей, ведалі многія. Яна вяла семінары для прыёмных бацькоў, выступала як блогер у інтэрнэце і многім дапамагала парадай, бо была не толькі маці-выхавальніца, але і дзіцячы псіхолог па адукацыі. Іх сям'я не так даўно была адзначана на ўзроўні дзяржавы, пра іх шмат пісалі ў сродках інфармацыі. Усе, хто ведаў Кацярыну Онахаву асабіста, называлі яе аптымісткай, светлым і пазітыўным чалавекам. І тут... дастаўлена ў бальніцу з прыкметамі павешання. Не хочацца нават верыць, але даводзіцца.

Вось што сказаў карэспандэнту газеты **афіцыйны прадстаўнік упраўлення Следчага камітэта па Брэсцкай вобласці Руслан МАКАРУК**:

— Пружанскім раённым аддзелам следчага камітэта праводзіцца праверка па факце смерці маці-выхавальніцы аднаго з дзіцячых дамоў сямейнага тыпу, якая, паводле папярэдняй версіі, скончыла жыццё самагубствам. Высвятляюцца ўсе акалічнасці трагедыі.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ФАКТЫ

НЕСАПРАЎДНЫ ПАЛКОЎНІК

52-гадовая жыхарка абласнога цэнтра паверыла махляру, які прадстаўляўся вайскоўцам, і страціла буйную грашовую суму.

Знаёмства адбылося праз інтэрнэт: на фатаграфіях у сацыяльнай сетцы мужчына красаваўся ў вайсковай форме. Пасля віртуальных кантактаў ён так зацікавіў жанчыну, што яна згадзілася з'ездзіць да яго ў госці ў ЗША, пералічыўшы электронным пераводам у некалькі этапаў амаль 10 тысяч долараў — быццам у кошт аплаты паслуг за атрыманне візы. Пасля гэтага аферыст больш на сувязь не выходзіў, а пацярпелая звярнулася ў міліцыю. Ужо вядома, што зламыснік выдаваў за свае фатаграфіі высокапастаўленага вайскоўца з ААН, скапіраваўшы іх з сайта арганізацыі.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

МОЦНЫ «АРЭШАК», або Баявік са «змазаным» фіналам

Гэтая ўнікальная крымінальная гісторыя — яскравы прыклад таго, як чарга недарэчных, неабдуманых учынкаў пад уплывам алкаголю можа прывесці да вельмі сур'ёзных наступстваў.

— Жыхар Наваполацка працаваў аператарам аўтазапраўкі і пазітыўна характарызаваўся калегамі і знаёмымі, пакуль не знайшоў аднойчы на палігоне ў Дрэтуні два імітацыйныя патроны, якія выкарыстоўваюцца на вучэннях. Ён вырашыў пакінуць гэты арсенал сабе. І тым самым здзейсніў цяжкае злачынства: незаконнае набыццё, нашэнне, перавозка і захоўванне выбуховых прылад, — а гэта каравецца законам. Прыхаваў ён боепрыпасы на дачы ў вёсцы Гарадок Вяркудскага сельсавета, — расказвае **Наталля АВАДНЁВА, памочнік пракурора Ушацкага раёна**.

Па законах не толькі тэатральнага, але і жыццёвага жанру, калі на сцяне вісіць ружжо, у кульмінацыйны момант яно павінна выстраліць. І такі момант настаў, калі новапалачанін у чарговы раз пасварыўся з жонкай. Ды так сур'ёзна, што вырашыў накласці на сябе рукі. Праўда, спосаб самагубства выбраў вельмі ўжо тэатральны: вырашыў змайстраваць муляж выбуховай прылады, пад'ехаць з ім да будынка Ушацкага РАУС або да паста ДАІ, каб падумалі, што ён — чалавек, які намагаецца здзейсніць тэрарыстычны акт. Хацеў «прыгожа загінуць» пры затрыманні. Прыняўшы для храбрасці, узяўся за справу.

У ход пайшлі патроны, электрадэтанатар, акумулятарная батарэя мабільніка, правады і нават крухмал з цукрам. У выніку замест муляжу ў яго атрымалася сапраўдная выбуховая прылада, як пазней засведчылі эксперты. Вось толькі ў другім акце «п'еса» адхілілася ад сцэнарыя: прыехаўшы ва Ушачы, зламыснік не змог адразу знайсці будынак РАУС, таму здзейсніў чарговае глупства. На шашы каля ААТ «Лес» ён спыніў веласіпедыста і запіхаў яго ў салон аўто, каб той паказаў дарогу да міліцыі. Ад такой паездкі пажылы вясковы жыхар быў зусім не ў захапленні. Па-першае, на дарозе застаўся безнагляднага ляжаць яго новы веласіпед, а па-другое, вадзіцель прадэманстраваў яму «бомбу» і пнеўматычную вінтоўку. Аднак адразу да будынка РАУС новапалачанін не паехаў: спыніўшы машыну непадалёк ад аптэкі, загадаў пасажыру... скласці яму кампанію ў распіцці настойкі. Напэўна, гэта было самае экстрэмальнае застолле ў жыцці дзядулі...

Тым часам у райаддзел паступіў трывожны званок: адна жанчына бачыла, як вадзіцель аўтамабіля «збіў» веласіпедыста і запіхнуў яго ў машыну. На шчасце, фінал гэтай гісторыі аказаўся зусім не такім феерычным, як уяўляў яго галоўны герой. Аўтамабіль быў затрыманы супрацоўнікамі міліцыі каля лесу...

«Спектакль» скончыўся. Мужчына атрымаў пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам на 6 гадоў без канфіскацыі маёмасці.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

■ Тры пытанні да ўлады

«ЗОЛАТА» Ў ПРАЦЫ І НА ЗЯМЛІ

Сёлета на рэспубліканскім свяце хлебаробаў «Дажынкі» дэлегацыя Віцебскага раёна была адной з самых шматлікіх. Менавіта Віцебскі край стаў пераможцам у адпаведным рэйтынгу. Сёння ў раёне ствараюць «залатое кола»: вакол абласнога цэнтра наводзяць еўрапейскі лоск і распрацоўваюць незвычайныя турыстычныя маршруты.

Руслан Фурашоў.

З гэтай нагоды наш карэспандэнт задаў старшыні Віцебскага райвыканкама Руслану Фурашову тры пытанні.

— Па традыцыі, да наступных «Дажынак» пачынаюць рыхтавацца адразу пасля папярэдняга свята хлебаробаў. Хто сёлета прадстаўляў раён на «Дажынках»?

— У складзе нашай дэлегацыі на сёлетніх «Дажынках» былі сем чалавек. Гонару ўзяць удзел у свяце ўдастоіліся два сельскагаспадарчыя прадпрыемствы — ААТ «Рудакова» і «Альгоўскае», а таксама лепшыя механізатары і камбайнеры. У гэтым годзе мы атрымалі 75 тысяч тон збожжавых пры сярэдняй ураджайнасці 27,1 цэнтнера з гектара. Гэта, безумоўна, не рэкорд, бо былі нашмат лепшыя ўраджаі. Але ў агульным аб'ёме вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі па вобласці наш раён займае адно з вядучых месцаў. Спецыялізуемся на вытворчасці малака, мяса, збожжа, бульбы, гародніны. Ёсць цяплічны камбінат у адкрытым акцыянерным таварыстве «Рудакова», комплексы па вытворчасці ялавічыны ў ААТ «Ліпаўцы» і свініны ў філіяле «Лучоса» ААТ «Віцебскі камбінат хлебапрадуктаў», ААТ «Віцебская бройлерная птушкафабрыка».

— Руслан Васільевіч, на Віцебшчыне актыўна рэалізуецца праграма «Чыстыя палі». Што робіцца ў гэтым кірунку ў вашым раёне?

— Віцебскі раён — прыгарад абласнога цэнтра, і, зразумела, гэта абавязвае надаваць асаблівую ўвагу навядзенню парадку. У раёне сярод іншых дзейнічаюць дзве меліярацыйныя арганізацыі, якія пастаянна займаюцца выдаленнем драўнінна-хмызняковай расліннасці і павелічэннем контуру землекарыстання. У выніку гэты паказчык павялічылі фактычна ў два разы.

— Каб убачыць нешта цікавае, не абавязкова далёка ехаць. Чым, на ваш погляд, можа прывабіць турыстаў раён?

— У нас больш як 200 помнікаў археалогіі, у тым ліку 34 помнікі археалогіі, з іх 13 — рэспубліканскага значэння (гарадзішчы ранняга жалезнага веку). У рэспубліканскі спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў уключаны 54 помнікі гісторыі і культуры раёна. Недалёка ад Віцебска знаходзіцца маёнтак вядомага на ўвесь свет рускага мастака Ільі Рэпіна. У Віцебскім раёне, дарэчы, расце самая вялікая сасна Беларусі — каля вёскі Сушчава. Яе дыяметр — 140 сантыметраў, вышыня — каля 30 метраў, а прыкладны ўзрост — 250 гадоў. Ёсць і іншыя ўнікальныя месцы. І гэты патэнцыял трэба выкарыстоўваць.

Падрыхтаваў Аляксандр ПУКШАНСКІ

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

«ДАПЛАТА НЕ ПРАВОДЗІЛАСЯ, БО БЫЛО ЗНІЖЭННЕ НАДОЯЎ»

З СВК «Прагрэс» Чэрыкаўскага раёна на «гарачую лінію» нашай газеты патэлефанавала са скаргай на нізкую заработную плату адна з работніц (у рэдакцыі ёсць усе звесткі пра заяўніцу, у гаспадарцы таксама ведаюць, пра каго ідзе гаворка, але на старонках выдання мы вырашылі не ўказваць прозвішча). Жанчына працуе даяркай. Сказала, што апошняя зарплата, якую яна атрымала «чыстымі», як той казаў, на рукі, склала 1 мільён 90 тысяч рублёў...

— Гэта пры тым, што я даглядаю статак з 50-55 кароў. Акрамя таго, у мяне яшчэ шэсць цялят. Усё робім самі: і доім, і кормім, і караняплоды раздаём, і праходы на ферме пасля расчышчаем, — даводзіла нам заяўніца. Паводле яе далейшых слоў, работнікі спрабавалі высветліць, чаму ў іх такая малая зарплата. Аднак ні ад кіраўніцтва гаспадаркі, ні ад прадстаўнікоў райвыканкама, куды спрабавалі звяртацца, нічога так і не пачулі.

Мы звязаліся з упраўленнем сельскай гаспадаркі і харчавання Чэрыкаўскага райвыканкама, папрасілі разабрацца ў сітуацыі (уласна, для гэтага і патрэбна ведаць асобу заяўніка, бо інакш даць адказ на канкрэтнае пытанне немагчыма — **С.Р.**). Неўзабаве атрымалі падрабязную «раскладку» па налічэнні заработнай платы даярцы з СВК «Прагрэс» за жнівень.

Нам, у прыватнасці, паведамілі, што норма загрузкі — 46 галоў (а фактычна ў заяўніцы — 50). Расцэнкі за адзін цэнтнер малака наступныя: «экстра» ці вышэйшы гатунак — 7 242 рублі, вышэйшы гатунак ад першацёлак — 8 328 рублёў, першы гатунак — 3 621 рубель, другі гатунак — 3 000 рублёў. Даярцы за месяц агулам налічана за малако 970 432 рублі (за малако «экстра» і вышэйшага гатунку 440 530 рублёў, за першы гатунак 23 134 рублі, за вышэйшы гатунак ад першацёлак — 506 759 рублёў).

За ўтрыманне адной нецелі плацяць 4 334 рублі. «У вышэйзгаданай групе мелася 18 галоў». Выходзіць яшчэ 78 292 рублі. За прывагу аднаго цэнтнера цялят прафілактычнага перыяду да 20-дзённага ўзросту належыць выплаціць 128 018 рублёў. Аднак «у жніўні перадачы цялят 20-дзённага ўзросту ад даяркі цялятніцы не было».

Ідзём далей. «Санітарны дзень (дзяжурны дзень — 19 232 (у жніўні адроблена 28 дзён), за стаж 8 працэнтаў — 157 307». Калі складаць ўсё, улічваючы вышэйпералічанае, выходзіць 1 341 307 рублёў.

«Варта адзначыць, што надой малака ў жніўні склаў 14 180 кг, у той час як у жніўні 2012 года па гэтай групе надой складаў 15 278 кг (зніжэнне склала 1 098 кг).

У СВК «Прагрэс» у палажэнні па аплаце працы прадугледжана даплата за павелічэнне надою малака, але, паколькі адбылося зніжэнне, даплата не праводзілася.

За выкананне даведзенага задання па росце вытворчасці малака ў гаспадарцы прадугледжана прэмія ў памеры да 100 працэнтаў. На жнівень заданне складала 115,5 працэнта (ці 17 640 кг), аднак выкананне задання за гэты месяц склала толькі 80,4 працэнта (ці 3 460 кг) недабору малака да задання.

Раздача кармоў буйной рагатай жывёле даяркамі ўручную не праводзілася ў сувязі з тым, што з мая па верасень жывёла знаходзілася кругласутачна на пашы. Акрамя таго, раздача кармоў уваходзіць у абавязкі па пасадзе даглядчыкаў жывёлы».

Сяргей РАСОЛЬКА

Страсці па амуры

У МАГІЛЁВЕ АДБЫЎСЯ АПОШНІ СЁЛЕТА ВОСЕНЬСКІ КІРМАШ

Кірмаш прайшоў яшчэ і пад «знакам» рыбы. Такіх шматлікіх чэргаў каля рыбных прылаўкаў нельга ўспомніць, бадай, з савецкіх часоў. Выгадная цана і вялікі выбар зрабілі сваю справу. Амур, таўсталобік, карп і нават фарэль знайшлі свайго спажыўца. Каля кропкі гандляроў з вёскі Сідаравічы ўжо ў 12 гадзін было пуста: тавар скончыўся. Пакупнікі, якія спазніліся, імкнуліся як мага хутчэй займаць чаргу там, дзе яшчэ паблісквалі лускай жыхары сажалак.

Фота БЕЛТА.

Як паведамілі ва ўпраўленні гандлю Магілёўскага аблвыканкама, удзел у кірмашы прымалі больш за 30 гаспадарак з Магілёўшчыны і іншых абласцей. Заўважаны былі прадстаўнікі СВК «Рассвет» імя К. Арлоўскага, агракамбіната «Усход», Магілёўскай міжрайбазы, фермерскай гаспадаркі «Куцанаў і К». Жыхары абласнога цэнтра таксама мелі магчымасць зрабіць запасы агародніны-садавіны па даступных цэнах. Напрыклад, кілаграм бульбы каштаваў каля трох тысяч рублёў, морквы — крыху больш за тры тысячы, капусты — 2,5 тысячы.

Па інфармацыі ўпраўлення гандлю аблвыканкама, у Магілёве гэта была апошняя сёлета восеньская ярмарка. Наогул за верасень-кастрычнік у вобласці прайшло 100 кірмашоў, тавараабарот якіх склаў 5,7 мільярда рублёў.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ДОБРАЕ МЕСЦА НА ВОСЕНЬ ЖЫЦЦЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Раніцай дзеці будуць прывозіць сюды пажылога чалавека, альбо, па дамоўленасці, для яго дастаўкі ў аддзяленне будзе выкарыстоўвацца служба сацыяльнага таксі. На працягу дня для такіх людзей будзе запланавана і забаўляльная праграма, і адпачынак, і гутаркі з псіхолагамі. Будуць працаваць гурткі па інтарэсах, студыі.

Працягласць знаходжання ў такім аддзяленні на працягу дня будзе залежаць ад жадання самога старога чалавека і яго сваякоў і вар'іравацца ад некалькіх гадзін да цэлага дня. Пакуль такое аддзяленне будзе працаваць да 18 гадзін, але, калі будзе вывучаны попыт, не выключана, што часовыя рамкі змесцяць да 20 гадзін, гавораць спецыялісты.

Прапрацоўваецца і пытанне забеспячэння старых харчаваннем — з дапамогай камбінатаў школьнага харчавання або аб'яднання «Вітамін», якое гатуе ежу для бальніц. «Там гатуюць збалансаваную ежу, забяспечваюць зручную форму дастаўкі і прымальныя кошты», — кажа Ірына Дудка.

Па жаданні сваякоў можна будзе браць ежу і з сабой. У аддзяленні прадугледжаны бытавы пакой, дзе маецца пліта, халадзільнік, мікрахвалеўка. Супрацоўнікі цэнтра дапамогуць разагрэць ежу, пры неабходнасці могуць пакарміць пажылога чалавека.

— Супрацоўнікаў у аддзяленні будзе няшмат, будзем прыцягваць да працы валанцёраў, — дзеліцца планамі намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне. — У нашых тэрытарыяльных цэнтрах ужо адкрыта шмат клубаў, гурткоў па інтарэсах, і мы думаем, што людзі старэйшага пакалення, тыя, хто актыўныя, хто наведвае такія гурткі і яшчэ поўныя сіл і энергіі, самі могуць выступаць у якасці валанцёраў. У нас нават ёсць такі праект — «Пажылыя — старым».

«Дзіцячы сад для старых» будзе працаваць на гасразліковай аснове. Да канца года ў Мінску плануецца адкрыць такія ж аддзяленні ў Маскоўскім, Першамайскім і Партызанскім раёнах.

❍❍❍

Гэта не новая форма работы — нашы спецыялісты пераймаюць сусветны вопыт. Так, у Германіі такія «дзіцячыя сады» для пажылых існуюць ужо не першы год. Нярэдка яны ўваходзяць у склад інтэграваных амбулаторных сацыяльных цэнтраў. Карэспандэнту «Звязды» ўдалося наведаць адзін з іх — так званую вілу «Альбрэхт», якая ўключае ў сябе, апроч такога «дзіцячага сада» для старых, 29 прыстасаваных спецыяльна для пажылых людзей кватэр, а таксама дзве групы сумеснага пражывання для людзей з дэменцыяй і дыспансер для амбулаторнага догляду.

— Што тычыцца Цэнтра дзённага знаходжання, ён у нас адкрыты кожны дзень і дазваляе разгрузіць сваякоў, калі чалавек жыве не адзін. Калі чалавек адзінокі, цэнтр дае яму магчымасць сустрэцца і пагутарыць з іншымі людзьмі, — распавядае **кіраўнік службы па арганізацыі пражывання пажылых людзей Андрэ Шпон.** — У нас ёсць уласная транспартная служба. Сваіх наведнікаў мы збіраем раніцай, а ў 16 гадзін развозім па дамах.

Тут, у самым вялікім памяшканні, збіраюцца на абед. Тут жа праходзяць усе грамадскія мерапрыемствы, — паказвае нам велізарную залу Андрэ. — А пры неабходнасці кожны госць (так супрацоўнікі называюць сваіх пажылых падапечных) можа адпачыць у асобным пакоі. Акрамя таго, часта ў хатніх умовах сваякам цяжка пасадзіць пажылога чалавека ў ванну, дапамагчы яму памыцца. У нас з гэтым усё прасцей, бо тэрыторыя цалкам безбар'ерная.

Знаходжанне ў дзённых цэнтрах выплачваецца са сродкаў страхавання на выпадак неабходнасці догляду. Хоць часам чалавеку прыходзіцца даплочваць і з уласнай кішэні, але грошы гэта невялікія.

«Ніякіх дамоў састарэлых — мы жывём на віле!» — кажуць нямецкія старыя...

Дарэчы, першапачаткова будынак вілы «Альбрэхт» служыў звычайным домам для састарэлых, які належаў Чырвонаму Крыжу. Тут жылі пажылыя людзі, якіх традыцыйна даглядалі супрацоўнікі. Але новы час патрабуе новых стандартаў. Таму на яго базе было вырашана зрабіць нешта сучаснае, з прадастаўленнем максімальных свабод людзям, якія будуць тут жыць. Будынак быў пераабсталяваны. Цяпер гэта цэлы комплекс, асноўнае прызначэнне якога — забяспечваць хатнія ўмовы жыцця для сваіх 29 арандатараў.

Адна з яго жыхарак — **88-гадовая Ленарт Шэфер,** тут ужо тры гады.

— У мяне чацвёра дзяцей. Вось яны на фотаздымках са сваімі сем'ямі, — паказвае Ленарт на здымкі, развешаныя на сцяне. — Тут у Берліне паблізу жывуць тры маіх дачкі і шэсць унукаў, яны прыходзяць да мяне пастаянна ў госці.

Мне адзін час было вельмі няпроста: моцна балела нага, да таго ж я не магла самастойна залезці ў ванну. Трэба было вырашаць, што рабіць. Хоць двое з маіх дзяцей, якія жывуць тут, у Берліне, маюць уласныя дамы і хацелі забраць мяне да сябе, я вырашыла, што буду жыць самастойна. І калі з'явілася магчымасць трапіць сюды, я на працягу двух тыдняў прадала сваю кватэру і пераехала. І не шкадую аб гэтым. Мне зручна і ўтульна тут. Тут усё прыстасавана для такіх, як я: няма парогаў, затое ёсць парэнчы ўздоўж сцен, за якія можна трымацца пры хадзе, зручная ванна, трывожная кнопка на выпадак непрадбачаных сітуацый...

У маленькай кватэрцы — спальня, гасцёўня, кухня. Кожныя два тыдні да Ленарт прыходзіць маладая жанчына, якая робіць грунтоўную прыборку, а з паўсядзённымі справамі пажылая жанчына, па яе словах, спраўляецца сама, у тым ліку сама гатуе.

Пражыванне тут каштуе 750 еўра ў месяц (без харчавання). Насамрэч яно каштуе больш, але Чырвоны Крыж атрымлівае пад гэты праект субсідыі ад дзяржавы.

❍❍❍

З пачатку гэтага года ў Беларусі ўступіла ў сілу новая рэдакцыя закона «Аб сацыяльным абслугоўванні», дзякуючы якой з'явілася магчымасць рэалізацыі дзяржаўнага сацыяльнага заказу. Гэта значыць, на заканадаўчым узроўні прыняты механізм прыцягнення юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў да аказання сацыяльных паслуг і рэалізацыі сацыяльных праектаў. Цяпер некамерцыйныя арганізацыі змогуць прэтэндаваць на субсідыі дзяржавы ў гэтай сферы. Будзем спадзявацца, што з цягам часу і ў нашай краіне з'явяцца такія ж камфортныя і ўтульныя «вілы», якія прыйдуць на змену цяперашнім дамам састарэлых. Але для гэтага трэба, каб пачалася практычная рэалізацыя новага закона, каб злучылі свае намаганні дзяржава (перш за ўсё органы мясцовай улады), грамадскія арганізацыі і замежныя інвестары.

Святлана БУСЬКО.

■ Складнікі поспеху

ХТО ДБАЕ — ТОЙ МАЕ

Усё пачыналася па класічнай схеме — у 1997 годзе малады маладзечанскі прадпрымальнік Алег Паліціка вырашыў стварыць прадпрыемства па вытворчасці эластычных баваўняных бінтоў. Звычайна паспяховыя бізнесмены любяць спасылацца на цяжкасці пры рэгістрацыі і адкрыцці прадпрыемства, на першыя крокі, абцяжараныя многімі перашкодамі. Але ў гэтым выпадку ўвасабленню ідэі разумнага чалавека папярэднічала доўгая карпатлівая праца па вывучэнні тэхналогіі і патрэбы ў прадукцыі. А пачыналася ўсё з трох работнікаў і аднаго ткацкага станка, прывезенага з Кастрамы. На той час рынак краіны быў надзвычай бедны на аналагічныя вырабы, ды і большасць з іх завозілася як імпарт...

Сёння Алег Паліціка, адзін з найлепшых прадпрымальнікаў сталічнай вобласці, з гонарам гаворыць, што займае да 70 працэнтаў айчыннага рынку не толькі рознага тыпу звычайных бінтоў, але і цэлай гамы іншых падобных тавараў: гэта і бінты эластычныя, і эластычныя бандажы, і вырабы для падтрымання тонусу пазваночніка і суставаў, і анатамічныя падушкі, і розныя фіксуючыя бандажы, і кампрэсійныя рукавы, і вырабы з шынамі — пералік зойме многія старонкі...

Цікавы досвед прадпрыемства мае ў тым, як заваяваць рынак: паводле слоў кіраўніка, найперш усе сілы і таленты спецыялістаў і работнікаў былі скіраваны на асваенне найбольш якасных тэхналогій, выкарыстанне выключна натуральных матэрыялаў і вывучэнне рынкаў. Магчыма, тут асаблівага наватарства не было, але факт ёсць факт: цяпер на прадпрыемстве працуе каля сотні чалавек, якія на ўласнай зарплаце спасцігліі выгаду максімальнай зацікаўленасці ў канчатковым выніку.

Наступным крокам стала не толькі замяшчэнне імпарту, але і арыентацыя на экспарт. Вось цяпер, напрыклад, палова вырабаў накіроўваецца за мяжу: у Расіі, у буйнейшых прамысловых цэнтрах — Маскве, Екацярынбургу, Смаленску, а таксама і ў іншых краінах СНД ёсць прадстаўніцтвы «Белпа-мед». Іх утрыманне — справа не танная, але так дыктуе час. Звычайная, здавалася б, рэч — прабіваць дарогу ўсё далей і далей ад Беларусі, але ўсё грунтуецца на разліку і вывучэнні рынкаў, як унутранага, так і знешніх. Беларускія ж партнёры — гэта сеткі прадпрыемстваў «Фармацыя», «Медтэхніка», рэспубліканскі пратэзна-артапедычнага цэнтр, больш за сотню камерцыйных фармацэўтычных фірмаў, артапедычныя салоны, бальніцы і медыцынскія цэнтры. І калі сёлета Мінская вобласць зберагла на імпарце каля 60 мільёнаў долараў, дык унёсак у гэтую суму маладзечанскага прадпрыемства «Белпамед» больш чым важкі.

Яшчэ адным складнікам поспеху з'яўляецца індывідульны падыход да кожнага спажыўца — ці гэта заказ на дзясятак, ці на некалькі дзясяткаў тысяч вырабаў. Затым — жорсткія тэрміны паставак, якія бездакорна выконваюцца пры любых абставінах.

Цікава выглядае склад прадпрыемства, якое разам з усімі сваімі службамі, у тым ліку і адміністрацыйнымі, месціцца ў невялікім двухпавярховым будынку: калі раніцай на складзе бывае густа, то пад вечар — пуста.

— Па-першае — разлік, — расказвае Алег Паліціка. — Мы працуем літаральна «з рук у рукі» з кожным нашым атрымальнікам прадукцыі, таму і не выдаткоўваем на вялікія склады. Цяпер, праўда, пашыраемся, але толькі дзеля вытворчасці, бо ў Міністэрстве аховы здароўя праходзяць працэдуру зацвярджэння нашыя новыя вырабы. Якія — гэта пакуль сакрэт...

...Самі цэхі — а іх небагата, бо большасць станкоў аўтаматычныя — выглядаюць як, даруйце, школьныя майстэрні: невялікія, утульныя і вельмі цёплыя (работніцы ходзяць у лёгкім абутку, чым вельмі задаволеныя). Менавіта пра ўмовы працы кіраўнік таксама думаў ад пачатку стварэння вытворчасці.

Сёння прадукцыя «Белпа-мед» — гэта пазнавальны брэнд і якасныя, карысныя ўсім нам вырабы. І за невялікую сваю біяграфію прадпрыемства паказала, што поспех спадарожнічае тым, хто адначасова дбае пра ўвесь комплекс інтарэсаў: свае ўласныя, галіновыя і дзяржаўныя.

Пятро РАМАНЧУК

«Капялюшны вернісаж»

У Мінску адкрылася першая выстава галаўных убораў

Капелюшы з шоўку і воўны, скуры, тэкстылю, саломкі і бісеру — наведвальнікі выставы могуць не толькі пабачыць, але і нават прымераць упадабаныя экзэмпляры. Тут жа — капелюшы, якія насілі нашы бабулі і мамы ў 40-60-я гады.



Усяго ж на выставе прадстаўлены працы пятнаццаці майстроў з Беларусі і двух — з суседняй Расіі. Акрамя капелюшоў і іншых упрыгажэнняў для галавы, на выставе можна ўбачыць лялькі і палотны мастакоў. Але абавязковая ўмова — прысутнасць галаўнога убору на любым творы, выстаўленым у экспазіцыі. На ўрачыстым адкрыцці амаль усе наведвальнікі таксама былі ў разнастайных галаўных уборах.

Першая такая выстава будзе працаваць у сталічнай бібліятэцы імя Пушкіна да 10 лістапада — пры садзейнічанні Мінскага абласнога цэнтра народнай творчасці, творчага агенцтва «Арт-Экспа», майстэрні аўтарскай лялькі і творчага праекта «Фарбы душы».

Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.

ЗАСТАРЫНСКАЯ «РАНА»

ВОГНЕННЫЯ ВЁСКІ

Ніна Адамаўна Кузуб (Малечка) цяпер на пенсіі, жыве ў Брэсце. У яе добрая сям'я, звычайныя клопаты гаспадыні дома. Кожны год вясной яна ездзіць у родную вёску Застарынне Баранавіцкага раёна, каб наведаць магілы родных і пакланіцца помніку, які пастаўлены ў гонар усіх бязвінна знішчаных яе землякоў.

...Той дзень Ніна не памятае: ёй было ўсяго два гады. Аб страшных падзеях яна ведае з расповедаў сваякоў, аднавяскоўцаў. Застарынне знаходзіцца ў акружэнні лясоў. І пасля акупацыі многія жыхары вёскі падаліся ў партызаны. Недалёка дыслацыраваўся атрад імя Суворава. Яго прадстаўнікі і прыйшлі ў Застарынне правесці мітынг 1 мая 1942 года. Людзей сабралі, прамовы сказалі і палічылі, відаць, сваю справу зробленай. Праўда, у вёсцы засталося начаваць з паўтара дзясятка партызан. Яны і ўступілі ў бой з праціўнікам, калі раніцай у Застарынне наляцелі фашысты з 57-га карнага батальёна. Але ж сілы аказаліся няроўнымі, і партызанскае супраціўленне вораг зламаў за чвэрць гадзіны. А потым пачалася расправа з мірным насельніцтвам. Людзей зганялі ў дамы па 15-20 чалавек, расстрэльвалі з кулямёта, а хату падпальвалі. У той дзень былі знішчаны 382 чалавекі, з іх 70 — дзеці.

Тыя, хто на сваё шчасце некуды адлучыўся з вёскі ці змог уцячы ў лес, знайшлі роднае сяло ў папялішчы з гурбамі мёртвых цел. Пра гэта падрабязна напісана ў кнізе «Памяць. Баранавіцкі раён». Там жа змешчаны ўспаміны Васіля Ленькі, які адным з першых прыбег у вёску пасля расправы. Сярод мёртвых ён знайшоў Кацю Фурса. Яна стагнала і прасіла зняць з яе цела мёртвай жанчыны. Васіль вызваліў зямлячку і пабег шукаць яе сваякоў. Аказалася, муж, дзеці, бацькі Кацярыны — усе былі забітыя. Калі ж хлопец вярнуўся з далёкім сваяком, убачыў, што Каця памерла... Тыя, хто застаўся ў жывых, паціху хавалі сваіх родзічаў. За некалькі дзён у вёсцы выраслі фактычна новыя могілкі.

Ніна не памятае расправу, не памятае, як яе з сястрой вывеў у лес старэйшы брат. Затое памятае, што было потым. А потым — адчуванне страшэннага голаду. Увесь час хацелася есці. Гэта і ёсць яе першы ўспамін дзяцінства. Як яны выжылі, Ніна Адамаўна цяпер разумее з цяжкасцю. 13-гадовы брат, сам дзіця, фактычна выратаваў яе і 4-гадовую сястру Ліду. Лідзія Адамаўна памятае больш. Карміліся тым, што давалі спагадлівыя суседзі, збіралі крапіву, шчаўе, на полі шукалі бульбіну ці бурак. А бывалі дні, што наогул ні крошкі не трапляла ў рот. «Неяк выжылі. Нейкі асаблівы сялянскі запас трываласці быў закладзены, відаць, ад нараджэння, — з цяжкасцю стрымлівае слёзы Лідзія Кузуб. — Брат Міша, як умеў, нас даглядаў, мыў адзенне ў рэчцы. Дзе ён наогул браў вопратку для нас, не магу сабе зараз уявіць».

Міхаіл, які фактычна выратаваў жыццё сваім сёстрам, памёр даволі рана. Тыя падзеі, несумненна, адбіліся на яго здароўі. Ды і потым вайна нагадвала пра сябе ўсё іх жыццё.

Ніна трапіла ў Маўчадскую школу-інтэрнат, якую ўспамінае з нязменнай цеплынёй. Вучылася добра, пасля заканчэння паступіла ў БДУ на біялагічны факультэт. Але ж падчас вучобы даводзілася вельмі цяжка, не было бацькоў, якія падкінулі б прадуктаў, як таварышкам-аднакурсніцам, альбо дапамаглі б якой капейкай. Працавала вечарамі прыбіральшчыцай у Тэатры юнага гледача. І ўсё роўна не магла сабе дазволіць прыстойную сукенку ці пару абутку. Таму, калі прапанавалі застацца ў аспірантуры, адмовілася. Хацелася хутчэй паступіць на працу, атрымаць заробак, каб выбіцца з галечы. Па размеркаванні трапіла ў Брэст. Тут сустрэла свой лёс, даволі ўдала склалася і кар'ера. Толькі вось рана, нанесеная трагедыяй роднай вёскі, ніколі ўжо не загоіцца. Бо той дзень зрабіў яе сіратой, якой было наканавана лёсам прайсці столькі выпрабаванняў.

А вёска Застарынне потым адрадзілася. Доўга была цэнтрам саўгаса. Цяпер там працуе базавая школа. І маладая настаўніца часта прыводзіць дзяцей да помніка. Настаўніца — унучка Лідзіі, сястры Ніны Адамаўны.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

■ Погляд на Першую сусветную

ДЗІЎНЫ ВЫБАР

Напярэдадні Дня Перамогі беларускія СМІ паведамілі аб тым, што з'явіўся ў продажы набор плакатаў «Палкаводцы і военачальнікі зямлі беларускай», аўтарам якога выступіў падпалкоўнік запасу Віталь Чырвінскі. Асноўная мэта праекта, паводле слоў аўтара, папулярызацыя ваеннай гісторыі і выхаванне моладзі ў патрыятычным кірунку. Набор уключае ў сябе 28 невялікіх плакатаў, на кожным з якіх — военачальнік, народжаны на нашай зямлі або праславіўшы яе ў баях.

Сярод персаналій, прадстаўленых у падборцы, — самыя розныя людзі. Ёсць сярод іх, безумоўна, і вялікія палкаводцы, а ёсць і тыя, чыя веліч, мякка кажучы, вельмі спрэчная. Аднак асабіста ў мяне не мог не выклікаць здзіўлення адзін красамоўны факт. З 28 палкаводцаў, прадстаўленых у серыі плакатаў, толькі адзін мае дачыненне да Першай сусветнай вайны. Адзін!.. Гэта генерал ад інфантэрыі Кіпрыян Кандратовіч. Няўжо наша зямля была такая бедная на палкаводчыя таленты сто гадоў таму?

Як вядома, у час Першай сусветнай вайны было сфарміравана шэсць франтоў: Паўночна-Заходні, Паўднёва-Заходні, Паўночны, Заходні, Румынскі і Каўказскі. Дык вось, двума з гэтых шасці франтоў камандавалі беларусы. Генерал ад кавалерыі Васіль Гурко, прадстаўнік самай вядомай беларускай генеральскай дынастыі, у 1917-м узначальваў Заходні фронт са штабам у Мінску, а генерал ад інфантэрыі Аляксандр Рагаза ў тым жа годзе — Румынскі фронт, прычым некаторы час яму падпарадкоўваліся і саюзныя румынскія арміі. Ваеннымі акругамі краіны ў розныя гады камандавалі трое генералаў-беларусаў: Платон Лячыцкі, Яўген Радкевіч і Аляксандр Рагаза.

Пасаду камандуючага арміямі ў 1914—1917 гг. займалі 63 генералы. Дзевяць з іх былі беларусамі або ўраджэнцамі нашых зямель. А лік камандзіраў карпусоў беларускага паходжання ідзе ўжо на дзясяткі. З 60 кавалераў высокай палкаводчай узнагароды — ордэна Святога Георгія 3-й ступені — шасцёра беларусаў (чатыры генералы ад інфантэрыі, генерал-лейтэнант і палкоўнік). Варта ўзгадаць і іншы факт: з 36 загінулых падчас Першай сусветнай генералаў рускай арміі — шасцёра беларусаў.

Сярод беларускіх военачальнікаў часоў Першай сусветнай былі сапраўды выдатныя палкаводцы. Першым з іх трэба назваць ураджэнца Гродзеншчыны, сына простага вяскоўца святара, генерала ад інфантэрыі Платона Лячыцкага. Усю вайну ён камандаваў 9-й арміяй і стаў адным з асноўных «аўтараў» легендарнага Брусілаўскага прарыву. Армія Лячыцкага адна трымала на сабе ўвесь паўднёвы ўчастак Паўднёва-Заходняга фронту, на цэлы месяц адтэрмінаваўшы падзенне Бухарэста! Узнагародамі генералу сталі вышэйшыя баявыя ордэны Расіі — Святога Георгія 4-й і 3-й ступеняў, а таксама Георгіеўская зброя з брыльянтамі, якой за ўсю вайну ўдастоіліся толькі восем военачальнікаў. Галасы ваенных гісторыкаў гучаць ва ўнісон: гэта самы таленавіты рускі палкаводзец армейскага ўзроўню часоў Першай сусветнай. У 1920-м Платон Аляксеевіч уступіў у Чырвоную Армію, але быў неабгрунтавана абвінавачаны ў стварэнні антысавецкай арганізацыі і памёр у турэмнай бальніцы.

Не менш заслужаным быў віцябчанін генерал ад інфантэрыі Яўген Радкевіч, чый 3-і Сібірскі армейскі корпус вясной 1915-га выратаваў ад гібелі ўсю рускую 10-ю армію, вытрымаўшы ўдар трох германскіх карпусоў. Аб Радкевічу захоплена адзываўся нават яго праціўнік, знакаміты нямецкі стратэг Э. фон Людэндорф. Дарэчы, пасля рэвалюцыі генерал ад інфантэрыі Радкевіч разам з трыма сынамі-афіцэрамі паступіў на службу ў Чырвоную Армію, выкладаў тапаграфію ў ваенным вучылішчы і памёр у 1930 годзе, калі з'яўляўся персанальным пенсіянерам усесаюзнага значэння.

А віцябчанін генерал ад інфантэрыі Аляксандр Рагаза прайшоў доўгі і складаны шлях ад полацкага кадэта да ваеннага міністра Украіны. Яго 4-я армія ўвесь 1916 год вяла найцяжэйшыя баі ў Беларусі — у сакавіку на возеры Нарач, а ў чэрвені-ліпені — пад Баранавічамі. Гэта былі дастойныя спробы выгнаць германскіх акупантаў з беларускай зямлі. Пасля рэвалюцыі, у 1918-м, Рагаза ўзначаліў узброеныя сілы незалежнай Украінскай Дзяржавы, стаўшы ваенным міністрам краіны. А праз год генерал загінуў пад кулямі бандытаў атамана Грыгор'ева: адмовіўся ўступаць у яго войска і быў расстраляны.

Словам, сто гадоў таму беларусы ніяк не маглі паскардзіцца на адсутнасць у іх радах таленавітых палкаводцаў, якія праславіліся бліскучымі подзвігамі. Тым больш дзіўны выбар аўтара падборкі плакатаў В. Чырвінскага. Слана ён, як кажуць, і не заўважыў, не надаўшы ўвагі ні «жалезнаму Лячыцкаму» — правай руцэ А. Брусілава, ні В. Гурко, які камандаваў Заходнім фронтам у Беларусі, ні А. Рагазе. А выбраў для падборкі сваіх плакатаў Кандратовіча...

Кіпрыян Кандратовіч сапраўды быў фігурай своеасаблівай. У руска-японскую ён змагаўся храбра, быў удастоены ордэна Святога Георгія 4-й ступені. На фронт Першай сусветнай генерал ад інфантэрыі Кандратовіч трапіў у жніўні 1914-га на пасадзе камандзіра 23-га армейскага корпуса. Але замест таго, каб прыкрываць адыход суседняга 15-га корпуса, які адступаў, кінуў свае войскі на волю лёсу і паехаў у тыл. Залішне нагадваць, як паставіліся б да працягу ўсяго 1918 года пад германскай акупацыяй? Некаторыя сучасныя гісторыкі пераконваюць, што генерал шчыра ўсвядоміў беларускую ідэю і марыў служыць незалежнай Беларусі. Але паверыць у гэтую кранальную гісторыю складана. Хутчэй за ўсё, Кандратовіч, пакрыўджаны на ўсе папярэднія ўлады (і «царскую», і «дэмакратычную»), проста вырашыў зрабіць стаўку на нацыяналістаў. Калі б «беларуская» карта згуляла і ў свеце, з'явілася б незалежная Беларусь, то Кандратовічу ў такім выпадку быў бы забяспечаны пост ваеннага міністра або пасада Вярхоўнага Галоўнакамандуючага.

Але не зраслося. І давялося Кандратовічу паспешліва шукаць шчасця ўжо ў іншай краіне — Літве. Відаць, служыць яму было ўсё роўна каму. У 1920—1921 гадах Кіпрыян Антонавіч быў віцэ-міністрам ахоўны края Літвы, пасля чаго выйшаў у адстаўку і перасяліўся ў свой маёнтак, што знаходзіўся недалёка ад Гродна (тады гэта была тэрыторыя Польшчы). Там Кандратовіч і памёр 31 кастрычніка 1932-га.

Вось такая біяграфія. Уся падпарадкаваная таму часу, палітыцы, неадкладным інтарэсам. Вось

На выдатнага палкаводца зямлі беларускай Кіпрыян Кандратовіч, які бяздарна праваліў самую першую даручаную яму кампанію 1914-га, не цягне пры ўсім жаданні. Не цягне ён нават на ролю стваральніка беларускіх узброеных сіл.

Кандратовіча за аналагічны праступак у Чырвонай Арміі летам 1941-га. А вось у Рускай імператарскай арміі яго ўсяго толькі знялі з пасады. Адбылося гэта 30 жніўня 1914 года, праз 40 дзён пасля пачатку вайны. І ўсё. Больш у баявых дзеяннях генерал Кандратовіч не ўдзельнічаў.

Вярнулі яго ў армію толькі 8 мая 1917 года. Тады «праклятыя царскі рэжым» паў, і Часовы ўрад узмоцнена «чысціў» армію ад генералаў «старой загартоўкі». На змену ім ішлі военачальнікі, якія імкнуліся выслужыцца перад новай уладай. Да такіх адносіўся і Кандратовіч, які атрымаў у камандаванне 75-ю пяхотную дывізію. Праўда, ніяк праславіцца ў баях гэтае злучэнне не змагло. А там грымнулі і кастрычніцкія падзеі, пасля якіх Кандратовіч паехаў у родную Беларусь, дзе стары генерал увайшоў у Народны сакратарыят Беларускай Народнай Рэспублікі, а са снежня 1918 года займаў пасаду міністра абароны БНР.

Што прымусіла К. Кандратовіча служыць на зямлі, якая была на толькі на выдатнага палкаводца зямлі беларускай Кіпрыян Кандратовіч, які бяздарна праваліў самую першую даручаную яму кампанію 1914-га, не цягне пры ўсім жаданні. Не цягне ён нават на ролю стваральніка беларускіх узброеных сіл. У 1917—1918-м пад кіраўніцтвам Кандратовіча ніводнай баяздольнай (і нават небаяздольнай) беларускай вайсковай часці так і не было створана. А вось на Румынскім фронце ў гэты ж час быў паспяхова «беларусізаваны» цэлы 4-ы армейскі корпус, які атрымаў назву Беларускага армейскага. Тры паўнавартасныя дывізіі былі ўкамплектаваны выключна салдатамі — беларусамі па нацыянальнасці. І ажыццёўлена гэтая ідэя была пад кіраўніцтвам генерала ад інфантэрыі Д.Шчарбачова і генернал-маёра І. Пажарскага. Калі і лічыць кагосьці прабацькамі ўзброеных сіл незалежнай Беларусі, дык гэта іх.

Вячаслаў БАНДАРЭНКА,
член Саюза пісьменнікаў Беларусі, тэлевядучы

■

■ Масты дружбы

БЕЛАРУСЬ — ЯГО ЛЁС...

«Гісторыя аднаго кажушка» — аповесць казахскага пісьменніка, у якім расказваецца пра Беларусь партызанскую

З чарговай камандзіроўкі прывёз кнігу «Сэрца, народжанае для дабра» (па-казахску назва яе гучыць так: «Жаксылыкка жаралган журек»). І прысвечаны гэты том лёсу, творчасці аднаго з актыўных арганізатараў асветніцтва ў Казахстане, грамадскаму і дзяржаўнаму дзеячу, пісьменніку і вучонаму Адзію Шарыпаву. Уручылі мне гэтае выданне ў падарунак у Інстытуце літаратуры і мастацтва Акадэміі навук Казахстана ў Алматы.

— Адзій Шарыпаў, — адразу заўважыла кандыдат філалагічных навук і добры сябра беларускай літаратуры Святлана Ананьева, — першы з казахаў, чыё імя ўключана ў Брытанскую Энцыклапедыю. У свой час ён быў міністрам асветы Казахскай ССР, першым сакратаром Саюза пісьменнікаў Казахстана, сакратаром Саюза пісьменнікаў СССР. Адзія Шарыпава выбіралі дэпутатам Вярхоўнага Савета Казахскай ССР і Вярхоўнага Савета СССР, намеснікам Старшыні Савета Саюза Вярхоўнага Савета СССР. Працаваў пісьменнік і дырэктарам Інстытута літаратуры і мастацтва імя М. Аўэзава. Таленавіты педагог і вядомы вучоны, ён унёс вялікі ўклад у стварэнне падручнікаў на казахскай мове. Вось у гэтай кнізе ўпершыню выдадзены не толькі ўспаміны пра славутага даследчыка літаратуры, але і архіўныя дакументы, якія ўяўляюць вялікую навуковую, гістарычную цікавасць.

...А што ж яднае Адзія Шарыпава з Беларуссю? У лютым 1940 года маладога казаха прызвалі ў армію. І патрапіў ён служыць у 7-ю танкавую дывізію, якая дыслацыравалася ў той час у Беластоцкай вобласці. Першы бой з фашыстамі — 22 чэрвеня 1941-га... Адступленне. Акружэнне, з якога нельга было вырвацца... І салдат застаўся на акупіраванай тэрыторыі. Шлях для патрыёта мог быць толькі адзіным — змагацца з ворагам. І Адзій трапляе ў партызанскі атрад... Колькі слоў з баявой характарыстыкі на сакратара камітэта камсамола 2-й асобнай Клятнянскай партызанскай брыгады А. Шарыпава: «... арганізуе адзін з першых партызанскіх атрадаў у Мухінскіх лясах (Ершыцкі і Рослаўлькі раёны Смаленскай вобласці)... Удзельнічае ў многіх баявых аперацыях, якія праводзяць атрад, батальён, брыгада, выяўляе сябе выключна смелым, знаходлівым, мужным камандзірам». Разам з таварышамі па партызанскай барацьбе Адзій Шарыпаў дзейнічаў на памежных беларуска-расійскіх тэрыторыях. Атрад Сашы (так пазней баявыя сябры называлі падраздзяленне Шарыпава) змагаўся з ворагам і ў Краснапольскім раёне, на Магілёўшчыне.

Казахстан і Беларусь — дзве кропкі адліку ў светаўспрыманні Адзія Шарыпава.

Дзякуючы падтрымцы мясцовага насельніцтва наладжваліся засады, партызаны ўзрывалі масты, чыгуначныя магістралі, знішчалі варожую тэхніку... У пачатку кастрычніка 1943 года 2-я Клятнянская брыгада злучылася з часцямі Чырвонай Арміі.

...Сардэчныя адносіны да шматпакутнага беларускага народа назаўсёды захаваліся ў душы адважнага казаха. Пасля Вялікай Айчыннай вайны Адзій Шарыпаў стараўся падтрымліваць сувязі са сваімі братамі па зброі, па змаганні з фашыстамі ў магілёўскіх і смаленскіх лясах. У 1985 годзе былы партызан наведаўся ў Краснапольскі раён. Вось што расказвае ўдава пісьменніка — Клара Мынжасарава: «Ён заўсёды з удзячнасцю ўспамінаў жыхароў вёсак, мястэчак, якія сустракаліся на яго партызанскім шляху. Гэтыя людзі, што жылі ў акупацыі, цярпелі здзекі фашысцкай навалачы, дапамагалі партызанам, як толькі маглі, наколькі хапала іх сіл. Здавалася, і праз сілу перажылі». І, вядома ж, вайна не магла не адбіцца на творчасці былога беларускага партызана. У аповесцях Адзія Шарыпава адлюстраваны не проста гістарычныя падзеі — у кожным з твораў перад чытачом паўстаюць героі, якія маюць рэальныя прататыпы. Беларусь, беларусы прысутнічаюць у такіх аповесцях, як «Дачка партызана», «Гісторыя аднаго кажушка», «Помста», «Зоркі ў цямніцы». Вобразна, рэльефна выпісаныя партрэты нашых землякоў, партызан розных нацыянальнасцяў, што змагаліся на беларускай зямлі поруч, выклікаюць сімпатыі, назаўсёды застаюцца ў памяці. Дакументалізм твораў нараджае асаблівы давер да аўтара. Літаратурныя адметнасці і рэальна-жыццёвая аснова — вось два складнікі, што акрэсліваюць мастацкі свет казахскага пісьменніка. Па сцэнарыі Адзія Шарыпава быў зняты кінафільм «Лясная балада». Між іншым, кінакарціна атрымала высокую ацэнку на фестывалях у Ташкенце і Алматы. У гэтым фільме мастак слова, празаік і кінадраматург сцвердзіў свае перакананні пра тое, што «свет надзвычай вялікі, бязмежны, сапраўдная ўзнёслая паэма жыццесцвярджальнасці» і мастацтва павінна ў гэтым свеце служыць выключна «агульначалавечым каштоўнасцям і гуманізму». Так і пісаў гэтую жыццесцвярджальную паэму ўсім сваім лёсам салдат, партызан, пісьменнік Адзій Шарыпаў.

Вельмі шчымлівая аповесць «Гісторыя аднаго кажушка». Твор цалкам аўтабіяграфічны. Сюжэт аповесці падмацаваны ўспамінамі сведкаў і відавочцаў тых грозных дзён. У снежні 1941 года будучага пісьменніка цяжка параніла ў грудзі. І таварышы схавалі яго ў лесніка Рамана Андзіна. Мностваасколкаў са спіны параненага доктар выдаляў без наркозу, здолеўшы знайсці для яго толькі самагонку. А вось як перадае тыя ўспаміны ад самога героя Клара Жагіпараўна — удава пісьменніка. Яна расказвае не пра персанаж, а пра самога пісьменніка: «Адзій Шарыпавіч часта губляў прытомнасць. А калі яна вярталася, то бачыў у суседнім пакоі схіленую галаву вельмі прыгожай дзяўчыны. Яна ўсю ноч нешта шыла. Адной-чы раніцай сон патрывожыў ляснік: «Немцы блізка! Вам трэба зараз жа ісці!» Адзія пераклалі на насілкі, а накрыць яго няма чым: шынель увесь быў у крыві. Відавочна, што на марозе паранены проста не вытрымае. І тады дзяўчына падаравала партызану кажушок. «Ён сагрэе вас», — толькі і сказала прыгажуня. Доўгі час кажушок быў сапраўдным талісманам, абярэгам для казахскага хлопца...» І зусім не выпадкова аповесць прысвечана Еўдакіі Анодзінай. А кажушок пасля вайны захоўваецца ў адным з музеяў.

...Апошні раздзел кнігі, якую мне падаравалі ў Алматы, змяшчае лісты, пералік навуковых прац руплівага збіральніка гісторыі казахскай літаратуры, казахскага асветніцтва, бібліяграфію яго мастацкіх твораў. Мудры, празорлівы, дасведчаны — такім паўстае вучоны і пісьменнік у стасунках з сябрамі, калегамі. Сярод адрасатаў Адзія Шарапава — пісьменнікі розных краін, розных куточкаў былога Савецкага Саюза. Дружалюбны, адказны за слова і справу, уважлівы, надзвычай выхаваны, інтэлігентны — такім і застаецца Адзій Шарыпаў у памяці сяброў, паплечнікаў, прадстаўнікоў малодшага пакалення казахстанскай інтэлігенцыі.

Казахстан і Беларусь — дзве кропкі адліку ў светаўспрыманні Адзія Шарыпава. Сярод другіх дакументаў, змешчаных у кнізе, — і вітанне казахскага літаратара беларускаму народу ў сувязі з адным з юбілеяў Беларускай ССР: «Мне, як беларускаму партызану і казахскаму пісьменніку, вельмі прыемна павіншаваць беларускі народ з 60-годдзем з дня ўтварэння Беларускай ССР...»Далей ён успамінае, як дваццаць сем цяжкіх месяцаў правёў у беларускіх лясах, як прайшоў пешшу многімі сцежкамі зямлі беларускай. Успамінае свае сустрэчы з народнымі паэтамі Беларусі Петрусём Броўкам, Максімам Танкам, іншымі дзеячамі культуры, мастацтва Беларусі. Але ваенныя гады асабліва помныя... «Ніскі паклон табе, зямля беларусаў, ад нас — партызан з Казахстана! Ты зберагла і сагрэла нас на сваіх грудзях у цяжкія партызанскія гады. Калі бяруся за пяро, твой вобраз, Беларусь, паўстае перада мною. Твае абаронцы, партызаны заўсёды ў сэрцы маім, калі пішу свае кнігі пра партызанскія часіны ў тваёй прасторы, ды і ўвогуле заўсёды ў душы маёй і сэрцы маім!»

У кнізе надрукаваны шэраг унікальных фотаздымкаў. Адзій Шарыпаў на іх — з Міхаілам Шолахавым, Габітам Мусрэпавым, Расулам Гамзатавым, Канстанцінам Федзіным, Кайсынам Куліевым, Сырбаем Маўленавым, Георгіем Маркавым. І — з Максімам Танкам. Ёсць і ўнікальныя кадры з партызанскага юнацтва на беларускай зямлі.

Мурат Аўэзаў назваў Адзія Шарыпава чалавекам-місіяй, які быў рэкрутаваны для подзвігу сваім асабістым лёсам, гісторыяй і сваім генетычным кодам, для подзвігу ў імя казахскага народа. Але ж і было ў гэтым лёсе месца для нашай роднай Беларусі, якую так любіў казахскі пісьменнік і вучоны.

Мікола БЕРЛЕЖ.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

строительства жилого дома № 2 (по генплану) комплекса многоэтажных жилых домов не повышенной комфортности в агрогородке Сеница Сеницкого сельсовета Минского района Минской области

Данная проектная декларация отменяет действие проектной декларации строительства жилого дома № 2 (по генплану) комплекса многоэтажных жилых домов не повышенной комфортности в агрогородке Сеница Сеницкого сельсовета Минского района Минской области, опубликованной в газете «Звязда» 18 июля 2013 г. (№ 131 (27496)).

ИНФОРМАЦИЯ О ЗАСТРОЙЩИКЕ

Общество с ограниченной ответственностью «Витасанплюс» (ООО «Витасанплюс»).

Место нахождения: г. Минск, ул. Сурганова, д. 61, помещение 515.

Режим работы: понедельник – пятница с 9.00 до 18.00, обеденный перерыв с 13.00 до 14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

Государственная регистрация застройщика: Общество с ограниченной ответственностью «Витасанплюс» зарегистрировано Минским городским исполнительным комитетом 4 июля 2011 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190262038, в результате реорганизации путем преобразования Частного строительного унитарного предприятия «Витасанплюс», зарегистрированного решением Минского городского исполнительного комитета от 27 июля 2001 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190262038.

В течение трех лет, предшествующих опубликованию проектной декларации, ООО «Витасанплюс» принимало участие в строительстве жилого дома по переулку Томскому, д. 35 в г. Минске. Фактический срок строительства данного жилого дома составил 16 месяцев.

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОЕКТЕ

Цель строительства: строительство многоквартирного жилого дома № 2 в п. Сеница комплекса многоэтажных жилых домов не повышенной комфортности и подъездной автодороги в а.г. Сеница Сеницкого сельсовета Минского района.

Этапы и сроки реализации строительства: начало строительства – 1 квартал 2013 г., ввод дома в эксплуатацию – 1 квартал 2014 г., благоустройство и озеленение – 2 квартал 2014 г.

Государственная экспертиза проектной документации: экспертное заключение № 2563-70/11, выданное 13.01.2012 г. Дочерним Республиканским унитарным предприятием «Главгосстройэкспертиза по Минской области».

Местонахождение строящегося многоквартирного жилого дома: Минская область, Минский район, аг. Сеница, район улиц Набережной, местного проезда, ул. Я. Купалы, ул. Коммунальной.

Характеристика строящегося многоквартирного жилого дома: 9-этажный 107-квартирный 3-секционный жилой дом с техподпольем и теплым чердаком, входящий во 2-ую очередь строительства комплекса многоэтажных жилых домов неповышенной комфортности по серии М 464-9-У1-01. Жилой дом оборудован всеми необходимыми инженерными системами. Лифтовые установки приняты грузоподъемностью 400 кг. Источником теплоснабжения является существующая котельная пос. Юбилейный. В жилом доме запроектированы поквартирные системы отопления с устройством поквартирных узлов учета тепла. Для поквартирного учета холодной и горячей воды предусмотрена установка счетчиков СВХ-15 и СВГ-15. В каждой квартире предусмотрено устройство внутриквартирного пожаротушения. В здании выполняется автоматизированная система контроля и учета электроэнергии (АСКУЭ). Устройство абонентской проводки выполнено с использованием абонентского волоконно-оптического кабеля и абонентских оптических розеток, устанавливаемых в квартирах. Телевидение согласно технических условий выполнено с применением интерактивного телевидения «ZALA». Охранно-переговорное устройство (ОПУ) «ПИРРС-1000 Люкс» обеспечивает цифровой набор необходимого абонента с вызывного устройства (ВУ), организацию двухсторонней связи между абонентом и посетителем, дистанционное управление замком входной двери электронным ключом специальной формы. Транспортное обслуживание жилого дома предусмотрено от проектируемого проезда с ул. Набережной. Отделка квартир, предназначенных для коммерческой реализации, не выполняется.

Количество предлагаемых объектов долевого строительства: 8 единиц.

Цены на объекты долевого строительства:
однокомнатные квартиры – **12 000 000** рублей за 1 кв.м общей площади;
двухкомнатные квартиры – **11 000 000** рублей за 1 кв.м общей площади;
трехкомнатные квартиры – **10 000 000** рублей за 1 кв.м общей площади.

Условия оплаты: уплата цены объекта долевого строительства производится дольщиком единовременно не позднее 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации договора создания объекта долевого строительства в местном исполнительном и распорядительном органе. По соглашению сторон, уплата цены объекта долевого строительства может быть произведена дольщиком поэтапно в установленный договором период по графику платежей. По соглашению сторон, дольщику может быть предоставлена скидка от общей стоимости квартиры.

Условия возможного изменения цены строительства застройщиком в одностороннем порядке:
изменение статистических индексов стоимости строительно-монтажных работ;
изменение законодательства об уплате косвенных налогов.

Права застройщика на земельный участок: решение Минского районного исполнительного комитета (Минский райисполком) от 22 февраля 2012 г. № 1057 «О предоставлении земельного участка обществу с ограниченной ответственностью «Витасанплюс» для строительства многоквартирного жилого дома № 2 (по генплану) комплекса многоэтажных жилых домов не повышенной комфортности в агрогородке Сеница Сеницкого сельсовета Минского района Минской области»; свидетельство (удостоверение) № 600/1260-2528 о государственной регистрации в отношении земельного участка с кадастровым номером 623686605101001049, расположенного по адресу: Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, Сеницкий с/с, аг. Сеница, площадь – 0,5095 га, назначение – Земельный участок для строительства многоквартирного жилого дома № 2 (по генплану), составлено Республиканским унитарным предприятием «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» 28 февраля 2012 г.

Границы земельного участка: с севера – строящийся 9-этажный жилой дом, с запада – ул. Набережная с площадью, с востока – свободная от застройки территория, 9-этажный жилой дом № 3 по генплану, с юга – спортивное гнездо.

Площадь земельного участка: 0,5095 га.

Элементы благоустройства: проектом предусмотрено полное благоустройство территории с организацией подъезда, парковками общей вместительностью на 31 машино-место, тротуаром для пешеходов шириной 1,5 м, дорожки и площадки к жилому дому из бетонной плитки. На территории строительства жилого дома запроектирована площадка для чистки вещей, площадка для отдыха и детская игровая площадка. Территория оборудуется малыми формами архитектуры. Транспортное обслуживание жилого дома предусмотрено от проектируемого проезда с ул. Набережной. Проектом предусмотрено устройство подпорной стенки между жилыми домами № 2 и № 3 по генплану.

Количество в строящемся жилом доме и иных объектах недвижимости самостоятельных частей, передаваемых застройщиком дольщикам после ввода жилого дома в эксплуатацию:

Общее количество квартир – 108 ед., в том числе:
• однокомнатных квартир – 27 (общая площадь 40,69 кв.м);
• двухкомнатных квартир – 31 (общая площадь от 61,23 кв.м до 68,89 кв.м);
• трехкомнатных квартир – 50 (общая площадь 79,16 кв.м).

Функциональное назначение нежилых помещений в многоквартирном жилом доме: на первом этаже запроектированы помещение товарищества собственников и электрощитовая. Техподполье дома предназначено для размещения инженерных сетей. Межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию многоквартирного дома, поступают в общую собственность дольщиков.

Предполагаемый срок ввода многоквартирного жилого дома в эксплуатацию: 01 февраля 2014 года.

Договор строительного подряда: договор строительного генподряда № 31/05–12 от 31.10.2012 г., заключен Застройщиком с Открытым акционерным обществом «МАПИД».

Условия ознакомления с объектом долевого строительства: ознакомиться с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству можно в офисе уполномоченного представителя застройщика – ЧРУП «Вива Консалт» (торговая марка ViVa Invest), расположенного по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, д. 61, офис 517 (тел.: 8 017 2 900 901, 8 029 1 907 901) или на сайте **vivainvest.by**

■ Наш чалавек

Яўген ЛІТВІНКОВІЧ:

«БЫЦЬ ВА ЎСІХ НА ВАЧАХ? ТАКОЙ МЭТЫ Ў МЯНЕ НЯМА»

На радзіме ў Беларусі ён актыўна і настойліва ўдзельнічаў у конкурсах артыстаў-вакалістаў рознага ўзроўню — ад гарадскога фестывалю да маштабных рэспубліканскіх праектаў... Невысокі і каржакаваты, з нечакана высокім голасам юнак з першых нот уражваў публіку і суддзяў і запамінаўся надоўга. Але конкурсы міналі, а перспектывы заставаліся цьмянымі: на вялікай сцэне, відаць, Жэню ніхто з мэтраў не бачыў. Адны дзверы зачыняліся, ён цярпліва грукаў у другія. Потым, напэўна, перастаў чакаць цудаў. І рушыў за мяжу. Менавіта там Яўгену Літвінковічу і ўсміхнулася ўдача.

Спачатку ён зрабіў сапраўдны фурор на праекце «Украіна мае таленты», а потым на шоу «X-Factor» дайшоў да суперфіналу. Аказаўся другім, але гэты вынік шматлікія ўжо прыхільнікі ўспрынялі не менш, чым перамогу. І тут, што называецца, працэс пайшоў: першы кліп, запіс дэбютнага альбома, вялікі сольны канцэрт... Нядаўна Жэня Літвінковіч прадставіў ужо другі па ліку кліп на аўтарскую песню «Да цябе!». Праз некалькі дзён у артыста пачынаецца вялікі ўсеўкраінскі тур. Напярэдадні гастроляў, хоць графік у яго вельмі напружаны, Жэня распавёў «Звяздзе» аб тым, што змянілася ў яго жыцці, чаго не хапае чалавеку, мары якога збыліся, і ці лічыць ён сябе «фарматным» выканаўцам.

— Яўген, мінуў амаль год з моманту трыумфу на шоу «Х-Фактар». Як змянілася за гэты час ваша жыццё — няма адчування пераносу ў іншы сусвет?

— Не, знаходжуся па-ранейшаму ў межах Зямлі. (*Смяецца.*) Вялікая колькасць працы, асабліва цяпер, калі ідзе падрыхтоўка да канцэртнага тура, не дае магчымасці разняволіцца і пачаць лунаць у аблоках. Студыя—рэпетыцыя—студыя—сон... І так па коле. З іншага боку, менавіта гэтага я і хацеў. Так што скардзіцца вам на сваё цяперашняе жыццё я дакладна не буду!

— Ваш поспех падштурхнуў да актыўных дзеянняў і іншых маладых артыстаў, беларусы літаральна «пачкамі» пацягнуліся на кастынгі ўкраінскіх шоу. Ці сочыце вы за дасягненнямі суайчыннікаў?

— На жаль, не. Я не раблю з сябе гэткага мегазанятага і неверагодна запатрабаванага артыста. Проста ў мяне часу сапраўды хапае толькі на сон, дый тое не заўсёды. Што ўжо казаць аб праглядзе тэлевізара... Але што і як бы ў маіх землякоў ні складвалася ў межах розных тэлепраектаў, я заўжды трымаю за іх кулакі і жадаю поспеху!

— Дарэчы, ва Украіне нагул сабралася даволі вялікая «творчая дыяспара» беларусаў: тэле- і радыёпрадзюсары, журналісты, артысты... Ці адчуваеце вы чыюсьці дапамогу, падтрымку? Альбо ў асноўным кожны сам па сабе?

— Ведаеце, я заўжды і ва ўсім прывык спадзявацца толькі на сябе. Балазе, цяпер са мной працуе выдатная каманда. Якраз яна і падтрымае мяне, і падбадзёрыць, а пры неабходнасці можа і славеснага «кухталя» даць, калі занадта разнявольваюся. Я ж чалавек творчы — магу нешта забыцца, пераблытаць. А часам гэта штосьці — вельмі важнае. (*Усміхаецца.*)

— Аншлагавыя летнія канцэрты, два яркія кліпы, дэбютны альбом, усеўкраінскі гастрольны тур, практычна гатовы альбом, праца з моцным прадзюсарскім цэнтрам — здаецца, мары пра поспех у любімай справе збываюцца. І ўсё ж, чаго не хапае для шчасця?

— Родных і любімых людзей побач... А яшчэ вельмі хацелася б завесці дамашнюю жывёлінку — ката альбо сабаку. Але я разумею, што гэта вялікая адказнасць. Іх жа трэба карміць, выхоўваць, а я дадому ў кіеўскую кватэру прыходжу, па сутнасці, толькі паспаць і пераапрануцца. Таму пакуль што і гэтага не магу сабе дазволіць. А аддушыны якой-небудзь вельмі не хапае...

— У Беларусі ваш стыль часцей за ўсё характарызавалі адным словам: «нефармат». Ці адчуваеце сябе зараз «фарматным» артыстам? Ці імкняцеся наогул «патрапіць у хвалю» шоу-бізнесу?

«Творчасць мусіць заставацца палётам душы, а быць проста «гаворачай галавой» я не хачу».

— Шчыра кажучы, ніколі да гэтага не імкнуўся. Большасць песень у дэбютным альбоме напісана мной — і словы, і музыка. І сапраўды, я іх ствараў так, як сам адчуваю, не задумваючыся пра тое, возьмуць іх на радыё ці не. Творчасць павінна заставацца палётам душы, а быць проста «гаворачай галавой» я не хачу. Калі пэўныя творы трапляюць у ратацыю, магу гэтаму толькі парадавацца. Але мэты быць ва ўсіх на вачах у мяне няма.

— Як часта апошнім часам удаецца бываць на радзіме і каго, акрамя мамы, абавязкова старацеся ўбачыць? Ці падтрымліваеце вы стасункі з выканаўцамі, з якімі выступалі яшчэ ў «Новых галасах Беларусі»?

— Дома ўдаецца пабыць надзвычай рэдка. На жаль ці на шчасце, але канцэртны графік расце не па днях, а па гадзінах. Апошні раз на радзіме я быў месяцы тры ці чатыры таму. Заязджаў, і тое па працоўных справах, у родны горад. Удалося пабыць усяго адзін дзень. Але хоць бы так. Для мяне вельмі важна было пабачыцца з мамай і сястрой — яны вельмі па мне сумуюць... Дый я таксама, шчыра прызнацца, вельмі знудзіўся па доме... Так хочацца бачыцца з сям'ёй часцей! Што да хлопцаў і дзяўчат з «Новых галасоў Беларусі», то з некаторымі, як на той час пасябравалі, так і сябруем дагэтуль — перапісваемся ў сацыяльных сетках, віншуем адно аднаго з рознымі святамі. Словам, стараемся не губляцца.

«Заўжды трымаю кулакі за землякоў і жадаю ім поспеху!»

— Калі дазволіце, закранём асабістую тэму (сотні і тысячы прыхільніц затрымалі подых). Выпрабаванне меднымі трубамі часта аказваецца не па сілах сябрам і каханым творчых людзей. У вашым выпадку — ці засталіся сапраўдныя сябры і сапраўдныя пачуцці?

— Мне складана адказаць на гэта пытанне, бо ў Кіеве я, па сутнасці, адзін, за выключэннем тутэйшай каманды, з якой працую. Усе мае родныя і сябры засталіся ў Беларусі. Магчыма, калі б я вярнуўся назад, змог бы адчуць і сказаць, ці змянілася што-небудзь у нашых стасунках. Хачу верыць, што ўсё засталося як раней. Шчыра і па-сапраўднаму.

— Такі прынцыповы момант: Яўген Літвінковіч сёння — гэта беларускі ўкраінец ці ўкраінскі беларус? Розныя крыніцы, ведаеце, ужо разыходзяцца ў меркаваннях...

— Адкажу так: ён інтэрнацыянальны! (*Смяецца.*) Я ў першую чаргу артыст, а нацыянальная прыналежнасць, мяркую, для слухачоў дакладна не мае ніякага значэння. Як кажуць, галоўнае — каб чалавек быў добры.

— З продажам вашай жодзінскай кавярні «У Жэкі» тэму рэстараннага бізнесу вы для сябе таксама закрылі? Ці ўсё ж хочацца вярнуцца туды з параднага ўвахода?

— Вельмі хочацца! «У Жэкі» — гэта было маленькае ўтульнае месцейка, у якім я ўсё (ад дызайну да прыгатавання страў) рабіў уласнымі сіламі. Я быў і дырэктарам, і поварам, і барменам. Так што калі ў будучым і адкрыю сваю ўстанову грамадскага харчавання, то гэта ўжо будзе як мінімум рэстаран: трэба ж развівацца!

«Я лічу, што ўсё ў нашым жыцці адбываецца так, як павінна быць».

— Аглядваючыся назад, я шкадую... Працягніце, калі ласка, фразу.

— Аб тым, што калісьці аб чымсьці шкадаваў. (*Загадкава ўсміхаецца.*) Насамрэч, я лічу, што ўсё ў нашым жыцці адбываецца так, як павінна быць. Галоўнае — заставацца шчырым і сумленным і, нягледзячы на ўсе цяжкасці на шляху, рухацца далей. Чаго і вам усім жадаю!

Гутарыла Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота з афіцыйнага сайта артыста www.litvinkovich.ctb.ua

Даведка «Звязды»

Яўген Літвінковіч нарадзіўся 4 лістапада 1982 года ў Жодзіне ў сям'і фатографа і майстра па рамонце абутку. У 10 гадоў самастойна паступіў у мастацкую школу, якую скончыў з адзнакай. Паралельна займаўся баявымі адзінаборствамі (цяпер КМС па дзюдо).

У 2006 годзе ўзяў сваё першае Гран-пры — на фестывалі «Жодзінская вясна», пазней атрымаў спецыяльны прыз на абласным конкурсе. Удзельнічаў у праектах «Новыя галасы Беларусі», «Музычны суд», «Акадэмія талентаў», спрабаваў прабіцца ад Беларусі на «Новую хвалю». Летась заняў 2-е месца ва ўкраінскім тэлешоу «Х-Фактар» і падпісаў кантракт с прадзюсарскім цэнтрам СТБ.

■ Паверыць у сябе

ПРЫГОЖЫ, ЛЮБІМЫ, ПАСПЯХОВЫ...

КАБ БЫЦЬ ТАКІМ, НЕ АБАВЯЗКОВА МЕЦЬ МАДЭЛЬНУЮ ЗНЕШНАСЦЬ І НЕВЕРАГОДНАЕ БАГАЦЦЕ

Нехта сказаў, што жыць з нізкай самаацэнкай — усё адно што ехаць у аўтамабілі з уключаным тормазам. Бывае, што мы думаем пра сябе: я недастаткова прыгожы, разумны, шчаслівы... Часцей за ўсё гэта далёка ад ісціны, але нішто так не ўздзейнічае на наша самаадчуванне, як самаўнушэнне.

— Высокая ці нармальная самаацэнка — важная каштоўнасць, якая дазваляе дабіцца ў жыцці значна большага, — кажа **загадчыца псіхалагічнай лабараторыі Мінскага гарадскога псіханеўралагічнага дыспансера Таццяна УШАКЕВІЧ.** — Адкуль жа бярэцца нізкая самаацэнка? З дзяцінства, з бацькоўскага выхавання: «Зноў разбіў, недарэка!», «Паглядзі, на каго ты падобны, мурза!», «Простых рэчаў не разумееш, дурань!». Аднак бывае і так, што ў цалкам паспяховага чалавека самаацэнка раптам апускаецца да нулявой адзнакі. Часам для гэтага бывае дастаткова звестак аб здрадзе блізкага чалавека або аб раптоўным скарачэнні на працы. Акрамя знешніх абставін, сваю ролю тут іграе і тып тэмпераменту. У сангвінікаў і флегматыкаў самаацэнка, як правіла, стабільная, у халерыкаў — скача, а ў меланхолікаў часцей заніжаная.

Псіхалогія няўмольная: пакуль у чалавека праблемы з самаацэнкай, не бачыць яму гарманічных стасункаў з каханым і ў сям'і. Поле, прызначанае для кахання, застаецца полем бітвы. Значыць, самаацэнку трэба павышаць.

Дарэчы, калі вы хочаце вылучыць сярод знаёмых самадастатковага чалавека, паназірайце за ім: ці ёсць у яго лексіконе словы-ацэнкі? Калі ёсць, значыць, ён не самадастатковы. Высокая самаацэнка прыводзіць да... поўнай адсутнасці патрэбы ацэньваць сябе і наогул што б там ні было!

Падумайце: што ў свеце зменіцца ад таго, як я гэта ацаню? Хіба сітуацыя зменіцца толькі таму, што я лічу яе несправядлівай? Вядома, не. У маіх сілах адно: разабрацца, чаму гэта сітуацыя можа мяне навучыць, што я павінен зрабіць, каб мне стала камфортна і г.д. Як бы я не ацэньваў чалавека, лепей ён ад гэтага не зробіцца. Мяняемся мы па іншых прычынах: таму што развіваемся, таму што нам самім неабходны гэтыя перамены. Негатыўная ацэнка іншых нас толькі злуе, выводзіць з сябе, прымушае або камплексаваць, або рваць адносіны. Вось на што ідуць тыя, хто ацэньвае блізкіх.

Калі ж мы ацэньваем сябе і высвятляецца, што мы сабою незадаволены, мы проста аўтаматычна пасылаем у прастору сігнал, які аднойчы нам «адгукнецца». Хто-небудзь абавязкова нас прынізіць, пакрыўдзіць і г.д. Што ў сваю чаргу яшчэ больш панізіць нашу самаацэнку.

Іншы бок справы: занадта высокая самаацэнка, схільнасць да самалюбавання. «Я лепш за ўсіх!» Калі мы ўзвялічваем сябе, то прыніжаем іншых. Ці трэба тлумачыць, што мы атрымаем у адказ?



Крок за крокам:

1. Бацькі павінны памятаць, што калі ўвесь час паўтараць дзіцяці: ты нічога не ўмееш і г.д., то аднойчы яму не абмінуць праблемы з самаацэнкай. Як бы там ні было, крытыкуйце толькі сам учынак, а не віноўніка. Дзіця павінна ведаць, што яго любяць такім, якое яно ёсць.

2. Забудзьцеся на тое, што моцна хочаце павысіць самаацэнку. Моцнае жаданне часам толькі перашкаджае. Жывіце і верце, што аднойчы даб'яцеся ўсяго, чаго захочаце.

3. Калі вырашаеце нешта зрабіць, рабіце гэта. Чым даўжэй спраеце пачаць, тым больш неперадольнымі здаюцца цяжкасці.

4. Кожны дзень даведвайцеся пра нешта новае, рабіце новае. Гэта пашырае зону душэўнага камфорту.

5. Не бойцеся задаваць пытанні. Лепей аднойчы здацца дурнем, чым раз за разам трапляць у непрыемную сітуацыю.

6. Рабіце ранішнюю гімнастыку, запішыцеся ў трэнажорную залу. Моцнае цела дзіўным чынам уплывае на дух.

7. Сачыце за «дробязямі»: гардэробам, прычоскай, парадкам у кватэры і на працоўным месцы.

8. Часцей хваліце сябе, нават за нязначныя поспехі.

9. Усміхайцеся. Усмешка — бальзам для душы.

10. Не параўноўвайце сябе з іншымі. Параўноўвайце толькі сябе ўчарашняга з сабой сённяшнім.

11. Ніколі не апраўдвайцеся. Спакойна патлумачце свой учынак.

12. Не давайце шанцу страху. Трымайце ў галаве запасны выхад. Калі і будзе няўдача, то гэта ўсяго толькі вопыт. Проста адмоўны.

13. Не імкніцеся быць бездакорным ва ўсім.

14. Дапамагайце навакольным. Так вы ніколі не адчуеце сябе беднадзейным няўдачнікам.

15. Плануйце. Дзень, тыдзень, год. І па ходу карэкціруйце свой план.

16. Нават самую нецікавую справу не рабіце механічна. Хутчэй і лепей мы зробім тое, чаму нададзім цікавасці.

17. Дружба і шчырыя адносіны — выдатныя лекі ад нізкай самаацэнкі. Калі нехта вас любіць, вы ўжо не аўтсайдар.

18. Дзейнічайце! Каб быць прыгожым, любімым, паспяховым, неабавязкова мець мадэльную знешнасць, неверагоднае багацце ці энцыклапедычныя веды ў галіне атамнай фізікі. Дастаткова верыць у сябе.

Вы — адзіны, непаўторны чалавек з талентамі і здольнасцямі, неабходнымі свету. З ростам веры ва ўласную непаўторнасць будзе расці і ваша ўдзячнасць за падораныя прыродай здольнасці і вам лягчэй будзе павярнуць іх у бок іншых людзей.

Святлана БАРЫСЕНКА

■

РАЗМАЎЛЯЙ ПА-БЕЛАРУСКУ І ЭКАНОМ ГРОШЫ!

Гэтай тэмай зацікавіў мяне знаёмы, які распавёў некалькі гісторый са свайго жыцця. Справа ў тым, што ў паўсядзённасці Зміцер размаўляе па-беларуску і ў апошні час часта атрымліваў зніжкі «па моўнай прыналежнасці». Адзін з выпадкаў — калі карыстальнік анлайн-бараholкі скінуў хлопцу 30 долараў пры пакупцы мабільнага тэлефона. І такое, кажа Зміцер, адбываецца з ім час ад часу. Мне падалося гэта незвычайным, і я даведалася пра гандлёвыя пункты сталіцы, дзе прапаноўваюць зніжкі беларускамоўным.

Парэкамендавалі завітаць у «Маскоўска-Венскі» гандлёвы цэнтр, што на праспекце Незалежнасці. Асартымент крамы «**InShoeZZ**» — абутак сусветна вядомых брэндаў.

— Скажыце, гэта праўда, што я магу атрымаць зніжку на ваш тавар, бо размаўляю па-беларуску? — пытаюся ў хлопца за прылаўкам.

— Безумоўна! — усміхаецца ён мне і адразу пытае, адкуль я даведалася пра іх акцыю.

Заўважна, што маладому чалавеку было прыемна пачуць, што «InShoeZZ» мне параілі іх кліенты. Ілья, адзін са стваральнікаў ідэі, расказвае, што краме паўтара года і для беларускамоўных кліентаў заўсёды дзейнічае 5-працэнтная зніжка на любую пару абутку. — Я зацікаўлены ў тым, як пашыраць ужыванне нашай мовы. Сёння стварэнне такой акцыі — адзінае, што я магу зрабіць для развіцця мовы. Гэта абсалютна не дзеля піяру. Хутчэй за ўсё — патрэба душы.

— А як пакупнікі даведваюцца пра зніжку?

— Пераважна звяртаюцца нашы пастаянныя кліенты. Бывае, што прыходзяць і махлююць. Па ломанай гаворцы адразу разумееш, ці сапраўды размаўляе чалавек па-беларуску. Але для нас ужо добра, калі чалавек успамінае словы на роднай мове. Яна асаблівая. І гэта абсалютная праўда.

Была ў нас ідэя ахапіць увесь паверх «Маскоўска-Венскага» гандлёвага цэнтра і далучыць астатніх павільёншчыкаў да прыхільнікаў роднай мовы, але не атрымалася пакуль, — усміхаецца. — Але вы можаце завітаць у краму насупраць.

Знаёмлюся з Валерыем, які займаецца продажам моладзевага жаночага адзення вядомых еўрапейскіх брэндаў у павільёне «Мой модны кут»:

Фота Марыі ШЫРОКАЙ.

— У асноўным наш кантынгент — студэнткі, школьніцы старшых класаў, — расказвае ён. — У краме пры пакупцы адзення ўсім беларускамоўным дзяўчатам зніжка. На жаль, не шмат іх звяртаецца. Дарэчы, 10 снежня будзе другі дзень народзінаў «Майго моднага кута», і ідэя беларускай мовы ўсталявалася ў павільёне з першых дзён існавання. Я думаю, што, калі ў мяне і зменіцца від гандлю, ён таксама будзе суправаджацца і пашырацца роднай мовай.

— Ці не думаеце, што многія могуць проста прыкінуцца беларускамоўнымі дзеля зніжкі?

— Цікава назіраць за людзьмі, якія па-рознаму рэагуюць на мову: адны ўступаюць у размову, другія кісла азіраюцца, ледзь не фыркаючы, і выходзяць. У асноўным гэта жанчыны пажылога ўзросту, у некаторых праз слова чуваць «чё-то, чё-чё...». Яны прыходзяць у час абеду і іх значна менш. Напэўна, гэта добра, бо спыняюцца ў краме, нават без набыцця рэчаў, тыя людзі, для каго атмасфера беларускасці блізкая і прыемная. Асабіста я не лічу сябе добрым мовазнаўцам — хутчэй за ўсё, аматарам, які дапускае памылкі. Але, між тым, не саромеюся перад людзьмі разгарнуць руска-беларускі слоўнік 1920-х гадоў, які заўжды ляжыць на рабочым стале, і пажартаваць.

— А чаму ў вас узнікла менавіта такая ідэя бонусаў?

— Неяк святкаваў 50-годдзе брата ў рэстаране «Мірскі замак». Сярэдневяковы інтэр'ер ліцвінскай Беларусі мне вельмі спадабаўся і нават захапіў, але ніводнага слова па-беларуску з вуснаў прыгожых дзяўчат-афіцыянтак, апранутых у нацыянальныя строі, я не пачуў — прынамсі, як і песняў, якія гучалі на англійскай і рускай мовах. Задумка цалкам беларускага рэстарана калісьці была добрая, але недапрацаваная, тым больш, як паведамілі супрацоўнікі, іх будынак выкупіў нейкі багаты ліявец.

Гэты выпадак падштурхнуў мяне рухацца ў кірунку сваёй мовы. Я лічу, калі б у 10% крам Мінска практыкавалася падобная сістэма бонусаў для тых, хто размаўляе па-беларуску, то гэта спрыяла б распаўсюджванню мовы сярод нашага насельніцтва. Мова вартая ўвагі. Яна гэтага заслужыла.

Таксама Валерый распавёў аб планах рамонту памяшкання. Ён хацеў бы знайсці мастака, які б намаляваў на сценах вобразы беларускіх прыгажунь Рагнеды, Еўфрасінні Полацкай, Барбары Радзівіл, каб наведвальнікі ведалі не толькі мову, але і гісторыю!

Прыемна, калі людзі клапоцяцца не толькі аб матэрыяльнай выгадзе, але і аб духоўнасці людзей, аб роднай беларускай культуры. Пагадзіцеся, так здорава заплаціць менш толькі таму, што размаўляеш па-беларуску. А можа, і вы, шаноўныя чытачы, атрымлівалі падобныя зніжкі «па моўнай прыналежнасці»? Падзяліцеся адрасам крамы!

Вераніка ЦВІРКО.

ЯШЧЭ АДЗІН КРОК «ДЫНАМА»

Вікторыя Азаранка скончыла сезон з траўмай. Футбольнае «Дынама» разграміла «Гомель». А Уладзімір Самсонаў зноў гучна нагадаў пра сябе. «Звязда» ўспамінае самыя яркія спартыўныя падзеі мінулага тыдня.

1. За чатыры туры да заканчэння чэмпіянату Беларусі па футболе мінскае «Дынама» аддзяляе пяць ачкоў ад другога месца. У матчы 28 тура падапечныя Роберта Маасканта з буйным лікам перайгралі «Гомель» — 4:1. Уругвайскі форвард бела-сініх Эрнан Фігарэда, дарэчы, паражае вароты гамяльчан у пятым матчы запар. Пасля сустрэчы галандскі трэнер падсумаваў выступленне сваіх футбалістаў, а таксама выказаў нараканні наконт судзейства: «Чакалі, што «Гомель» будзе дзейнічаць агрэсіўна, таму зрабілі акцэнт на граматнай пазіцыйнай гульні. А хуткі гол Канцавога спрасціў задачу. Адзінае, чым незадаволены, — гол з пенальці. Думаю, пасля таго, як лік стаў 3:0, футбалісты трошкі расслабіліся і дазволілі саперніку стварыць некалькі момантаў. І зусім незразумела, чаму арбітры не рэагавалі на сітуацыі, калі гамяльчане былі

«Дынамаўцы» прарываюць шчыльную атаку «Гомеля».

ў афсайдзе. Менавіта ў такіх матчах і трэба забіваць больш, чым атрымліваецца... каб перастраховацца».

Неблагія перспектывы мінчан на другое месца адкрыліся пасля пятага запар паражэння іх прамога канкурэнта — салігорскага «Шахцёра». У гасцявым матчы гарнякі саступілі «Тарпеда»-БелАЗу. Напрыканцы сустрэчы гол у вароты Эдуардаса Курскіса забіў Вячаслаў Глеб. А вось лідар турнірнай табліцы БАТЭ саступіў «Нёману». Перамогу гродзенцам прынёс камерунскі паўабаронца Гі Эсаме, паразіўшы вароты жоўта-сініх.

Адзначым астатнія вынікі 28-га тура: бабруйская «Белшына», якая ўжо гарантавала сабе месца ў вышэйшай лізе ў наступным сезоне, перайграла «Славію» — 1:0, «Днепр» разграміў брэсцкае «Дынама» — 3:0, а «Нафтан» аказаўся мацнейшым за «Мінск» — 2:1.

2. Хакейнае «Дынама» нарэшце адчула смак перамогі. У хатнім матчы **«зубры» перайгралі хабараўскі «Амур»** — 3:2. Менш чым за дзве хвіліны да заканчэння матча бела-сінія саступалі 1:2, але трапны кідок Аляксея Калюжнага перавёў высвятленне адносін паміж камандамі ў авертайм. Але і дадатковы час не выявіў пераможцу. Тым не менш, па серыі булітаў віктарыю святкавалі падапечныя Аляксандра Андрыеўскага. Выратальную шайбу ў вароты хабараўцаў закінуў Збынек Іргл. З дваццаць ачкамі «зубры» па-ранейшаму займаюць перадапошняе месца ў заходняй канферэнцыі.

3. Не вельмі ўдала выступілі беларускія **цяжкаатлеты на чэмпіянаце свету ў Польшчы.** Па суме дваябор'я нашы спартсмены заваявалі два бронзавыя медалі. У вагавой катэгорыі да 69 кг вылучылася Дзіна Сазанавец, у катэгорыі звыш 75 кг — Кацярына Шкуратава. У мужчынскай частцы спаборніцтваў бліжэй усіх да п'едэстала аказаўся Аляксандр Макаранка. У вагавой катэгорыі да 94 кг беларус заняў чацвёртае месца, саступіўшы 6 кг бронзаваму прызёру з Казахстана.

4. У вырашальнай сустрэчы за выхад у паўфінал выніковага турніру, які праходзіў у Стамбуле, **Вікторыя Азаранка саступіла кітайскай тэнісістцы На Лі — 2:6 1:6.** У сярэдзіне першага сэта беларуска адчула боль у сцягне, але аніякія маніпуляцыі медыкаў не дапамагалі. Тым не менш спартсменка вырашыла не адмаўляцца ад працягу барацьбы і дагуляла матч фактычна «на адной назе». Сезон Вікторыя Азаранка скончыла на другім месцы ў рэйтынгу і з трыма тытуламі ў актыве — у Мельбурне (адкрытае першынство Аўстраліі па тэнісе), Досе і Цынцынаці. Прычым на апошніх двух турнірах у фінале беларуска перамагла Серэну Уільямс, якая сёлета праводзіла свой лепшы сезон у кар'еры.

5. Уладзімір Самсонаў стаў сярэбраным прызёрам розыгрышу **Кубка свету па настольным тэнісе.** У паўфінале беларускі спартсмен разграміў другую ракетку турніру, немца Ціма Боля — 4:0. А вось у вырашальным матчы Самсонаву ніякіх шанцаў не пакінуў кітаец Сю Сінь, які займае другое месца ў сусветнай класіфікацыі. Нагадаем, за сваю кар'еру Уладзімір Самсонаў тройчы выйграваў Кубак свету, дзе традыцыйна спаборнічаюць 20 лепшых тэнісістаў з усіх кантынентаў.

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.

Ігуменскі тракт

№ 36 (51)

■ Славуты зямляк

ПРЫЙДЗЕМ ТАБЕ ПАКЛАНІЦЦА

Газета «Звязда» сумесна з Палатай прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь распачынае праект па ўшанаванні славутых землякоў. Па ініцыятыве дэпутата Уладзіслава Цыдзіка першай асобай, якой будзе аддадзена належная даніна памяці, стане Адольф Янушкевіч. Гэты дзеяч, што родам з-пад Дзяржынска, зрабіў значны ўнёсак у развіццё не толькі нашай краіны, але і Казахстана, Польшчы, Расіі.

1 лістапада ў горадзе Дзяржынску і вёсцы Дзягільна, што побач з ім, пройдуць літаратурныя чытанні, урачыстае ўскладанне кветак, абмеркаванне лёсу славутай асобы. Прыедзе сюды і дэлегацыя з Казахстана, каб ушанаваць месца нараджэння і спачыну чалавека, якога яны лічаць і сваім героем.

Сёлета споўнілася 210 гадоў з дня нараджэння падарожніка-этнографа, перакладчыка, пісьменніка Адольфа Янушкевіча.

Ці мог спадзявацца ў пару сваёй вялікай падзвіжніцкай дзейнасці Адольф Янушкевіч, што праз стагоддзі яго імя будзе вядома адразу ў чатырох краінах, што яго працы будуць прызнаны як уклад у беларускую, рускую, польскую, англійскую, украінскую, казахскую культуры?..

Прычым цяжка вызначыць, дзе яго зорка гарыць ярчэй: у Польшчы, за адстойванне годнага лёсу якой ён быў пазбаўлены шляхецтва і маёмасці; у Расіі, што стала школай жыцця амаль на чвэрць стагоддзя; у Казахстане, дзе праявіўся яскравы талент летапісца; або ў Беларусі, адкуль пачаўся шлях у вялікі свет і дзе знайшоў апошні прытулак нястомны рупліўца.

Нарадзіўся Адольф Янушкевіч у Нясвіжскім замку 9 чэрвеня 1803 года. Слынная магнацкая сталіца стала той калыскай, дзе яму перадаліся лепшыя рысы талерантнага менталітэту беларусаў, дзе зарадзілася спагадлівае стаўленне да людзей. Усё гэта пазней адлюстравалася ў найвышэйшай павазе да казахскага народа, з прадстаўнікамі якога ён пазнаёміўся падчас ссылкі. У сібірскім Омску Янушкевіч працаваў у памежным упраўленні па справах з сібірскімі кіргізамі (продкамі сучасных казахаў), часта ездзіў з даручэннямі ў іх аулы. Яго прадбачлівыя словы, сказаныя ў сярэдзіне XIX стагоддзя, паказваюць глыбокае разуменне гістарычнай ролі казахаў: «Народ, які адораны тварцом такімі здольнасцямі, не можа застацца ў баку ад цывілізацыі: дух яе калі-небудзь пранікне ў кіргізскія пустыні, разнясе тут праменьчыкі святла, і прыйдзе час, калі намад, які сёння качуе, зойме ганаровае месца сярод народаў...»

Імя Адольфа Янушкевіча і сёння служыць сімвалам патрыятызму. Ён яскравы прадстаўнік той апантанай моладзі часоў дзекабрысцкага руху, якая гонар, сумленне, вернасць Радзіме ставіла вышэй за ўсе выпрабаванні і цяжкасці, якая праяўляла нязломнасць характару, нават калі гучаў смяротны прыгавор.

Адольф Янушкевіч наўмысна не ўступіў у шлюб са сваёй каханай Стэфаніяй. Ён, як сапраўдны мужчына, не мог змірыцца з тым, што жонка, нашчадкі таксама будуць несці «пячатку» яго пакарання. Бо за ўдзел у паўстанні 1830-1831 гадоў Янушкевіч быў пазбаўлены дваранства і ўсіх прывілеяў.

Наш зямляк — прыклад таго, як не скарыцца перад цяжкімі ўдарамі лёсу. Узор цярплівасці і ўнутранай сілы. Умовы жыцця сібірскага ссыльнага ён скарыстаў для ўзмацнення духу цэлага народа.

Хіба мог ён тады ацаніць сваю ролю ў папаўненні скарбаў сусветнай культурнай спадчыны,

зразумець уласную значнасць у наладжванні ўзаемаразумення паміж народамі? Моцны ўнутраны стрыжань падказваў яму, што рабіць: вывучаць мову народа, да якога прыкіпеў усёй душой, і рухацца наперад — у дзікі стэп, пераадольваць адлегласці, якія былі нялёгкімі нават для казакаў Сібірскага казачага войска, звыклых да доўгіх паходаў. Гістарычныя працы, створаныя Адольфам Янушкевічам, не маюць сабе роўных, паколькі работ па гісторыі Казахстана XIX стагоддзя амаль няма.

Талент нашага знакамітага земляка рэалізаваўся далёка па-за межамі роднай краіны. Аднак сваёй дзейнасцю ён прадэманстраваў усяму свету: вось якія яны, беларусы, людзі высокага гатунку.

Пахаваны Янушкевіч на сямейных могілках у вёсцы Дзягільна Дзяржынскага раёна побач з маці Тэкляй, пляменнікамі Марыляй, Міхаілам і дзецьмі брата Януарыя.

Казахстанскі рэжысер Сяргей Шафір, які жыве ў Ізраілі, адзін з сюжэтаў свайго дакументальнага фільма «Урокі польскага» прысвяціў Адольфу Янушкевічу. Зараз ён мае матэрыял для стварэння асобнага фільма пра нашага земляка. На думку Сяргея Шафіра, гэта можа быць сумесны гісторыка-культурны праект Беларусі, Польшчы, Казахстана і Расіі.

Алена СТЭЛЬМАХ

■ Мясціны, знітаваныя з душой

БЕЛЫЯ БАЛОТЫ

Багатая гродзенская зямля здаўна прыцягвала да сябе людзей. У нашай мясцовасці параўнальна някепска захавалася некалькі сядзібна-паркавых комплексаў, якія знаходзяцца на адной з дарог да перліны Гродзенскага краю — Аўгустоўскага канала. У некаторыя з іх — такія, як Свяцк магнатаў Валовічаў, Свяцк Гурскіх, — сёння прадпрымальнікі стараюцца ўдыхнуць новае жыццё. А вось былы панскі дом Тукалаў і вялікі парк, які прылягаў да панскай сядзібы, пакуль што чакаюць свайго адраджэння...

Па планіроўцы дом Тукалаў нагадвае традыцыйную хату: яшчэ адзін пакой, пакой і сені, якія мелі выхад на парадны ганак і гаспадарчы двор. Будавалі дом мясцовыя цесляры, якія мелі багаты вопыт і ведалі традыцыі. Унутранае аздабленне дома адпавядала тагачаснай еўрапейскай модзе. У буфетах і пасудных шафах быў дарагі фарфор, шкло, крышталь. Лічылася модным вырошчваць экзатычныя расліны, мець свой міні-звярынец. Неад'емным элементам аздаблення панскага дома былі кафельныя печкі.

Першыя звесткі аб існаванні маёнтка Белыя Балоты знаходзім у матэрыялах 2-й паловы XVIII стагоддзя. Паводле дакументаў парафіяльнага архіва Селіванаўскага касцёла, у 1798 годзе маёнткам валодаў Ян Мароз, суддзя былога Гродзенскага павета. 22 мая 1806 года прадаў яго канюшнаму Альберту Сабалеўскаму. А ўжо праз год, паводле геаграфічнага слоўніка польскіх зямель, быў прададзены Войцеху Сабалеўскаму. Багацеі Сабалеўскія прымалі чынны ўдзел у грамадска-гаспадарчым жыцці ваколіц. Графіня Сабалеўская ў 1865—1867 гадах з'яўлялася фундатарам будовы касцёла ў Селіванаўцах, які стаў месцам радавога пахавання іх сям'і. Недзе ў пачатку XX стагоддзя апошні з Сабалеўскіх прайграў маёнтак у карты пану Тукалу і ажаніў яго са сваёй дачкой.

Старажылы Белых Балот яшчэ расказваюць, што ў іх вёсцы жыў пан Тадэвуш Тукала са сваёй жонкай і 5 дзецьмі, які родам быў з гэтай мясцовасці. Бытуе легенда, што памесце называецца Белыя Балоты таму, што пан у гонар сваёй каханай Ядвісі загадаў засадзіць балоты, якія знаходзіліся за маёнткам, белымі лілеямі...

Каля іх дома знаходзіліся баракі і чваракі — жыллё для наёмнай сілы. Пан Тадэвуш быў добры гаспадар, працалюбівы, акуратны. Усе гаспадарчыя работы ляжалі на яго плячах. Старажылы-пакаёўкі расказваюць, што ён добра ставіўся да людзей, шчодра плаціў. Да яго ішлі на працу з ахвотай. Вельмі любіў дзяцей. Калі яму прыходзілі дапамагаць дзеці з вёскі, то даваў гасцінцы, уключаў паслухаць патэфон, дазваляў паглядзець жывёл у звярынцы. Пані, па ўспамінах мясцовых, была капрызная, але вельмі любіла музыку, кветкі, птушак.

Дачка Тукалаў Марыя-Гэлена ліха ездзіла на галандскіх скакунах, любіла паляванне, ладзіла адпачынкі каля начных кастроў, паходы, катанне на лодках па Аўгустоўскім канале. Пазней выйшла замуж у суседні маёнтак Гурскіх. У 30-я гады XX стагоддзя на прафесійнай аснове яна наладзіла аграТурызм, які значна папоўніў казну маёнтка, выратаваў яго ад банкруцтва.

Каля памесця быў разбіты ружоўнік з сотнямі сартоў руж, прывезеных з-за мяжы. Побач, у клетках, жылі паўліны, па двары бегалі цацаркі. Пан вельмі ганарыўся звярынцам, заўсёды паказваў яго гасцям — багацеям, якія наведвалі маёнтак.

Каля памесця быў разбіты ружоўнік з сотнямі сартоў руж, прывезеных з-за мяжы. Побач, у клетках, жылі паўліны, па двары бегалі цацаркі. Пан вельмі ганарыўся звярынцам, заўсёды паказваў яго гасцям — багацеям, якія наведвалі маёнтак.

Парк у Белых Балотах быў створаны ў 2-й палове XIX стагоддзя. Ён знаходзіцца ў выгіне невялікай рачулкі Беліца. На ўскрайку — арыгінальныя гаспадарчыя мураваныя пабудовы. Кажуць, што гэта сушыльня і гарэльня. У сушыльні сушылі тытунь, які вырошчваў пан Тукала. На паўночным баку захавалася сценка, складзеная з каменю, якая аддзяляла парк і сад ад іншых насаджэнняў. Да нашага часу захавалася некалькі лістоўніц. Некаторыя дрэвы — самі па сабе помнікі прыроды. Вольхі ў акопе складаюць 3,4 метра, ліпы — 3,1 метра. У парку і цяпер ёсць даволі шмат розных відаў вінаградных слімакоў, прывезеных панам з-за мяжы і штучна разведзеных тут у 30-я гады XX стагоддзя. За паркам — невялікі сад, да якога прымыкае ліпавая алея. Праўда сёння сад па загадзе мясцовых улад выкарчаваны.

Старажылы ўспамінаюць: «Парк быў дагледжаны. За рэчкай Беліца ўсе дарожкі былі пасыпаны жоўтым пяском, стаялі столікі і лаўкі, а ў раз, у празрыстай вадзе, вадзілася розная рыба.

Сучасны стан парка патрабуе адраджэння. Тут і цяпер растуць старыя лістоўніцы, ліпы-веліканы, дубы-помнікі, высачэзныя грабы. Унізе мноства кветак і лекавых траў: барвенак, сон-трава, чыстацел, піжма, чабор, святаяннік, ветраніца баравая — многія з іх занесены ў Чырвоную кнігу.

Вясной здзіўляе парк напаўняецца шматгалоссем. Мноства птушак насяляюць яго. У дуплах старых дрэў водзяцца совы, сіваваронкі, жоўны, дзятлы рознай афарбоўкі, стрыжы, сойкі, зязюлі, зімародкі і іншыя.

— Крыўдна, — кажуць мясцовыя жыхары, — што сёння парк страціў былую прывабнасць. А хацелася б, каб як і раней ён цешыў вока наведвальнікаў. Спадзяёмся, што з часам знойдуцца добрыя рукі, якія навядуць тут парадак. І турысты, якія едуць да Аўгустоўскага канала, змогуць спыніцца, пачуць расповеды экскурсаводаў пра жыццё і побыт былых уладальнікаў, даведацца, што тыя былі дбалымі гаспадарамі, наватарамі, эксперыментатарамі...

Пасля прыходу савецкіх войскаў пан Тукала ўцёк на Захад. Сын Яўген памёр яшчэ ў польскі час, Міхаіл быў забіты ў 1938 годзе ўласным парабкам. Астатнія, як і бацька, збеглі ў Еўропу.

У 1955 годзе, каб наведаць сваю былую сядзібу, прыязджаў з Варшавы ўнук Тадэвуша Тукалы. Ён быў моцна расчараваны, што прыгожы, дагледжаны раней маёнтак і парк цяпер такія запушчаныя. У былой сядзібе сёння знаходзяцца клуб і бібліятэка.

Марыя ХРАМЛЮК

■ Брэнд краіны

«КАЙФ АД НАРОДНЫХ КАСЦЮМАЎ»

Народны касцюм «ужываю» я бачыла гадоў 10—15 таму. Да бабулі ў вёску ў Валожынскім раёне прыязджаў хор з суседняга раёна, спяваў у самай вялікай хаце. Апрануты ўсе жанчыны (ды і некалькі мужчын) былі па-народнаму. Здаецца, усе падобныя, але ў кожнай нечым адметны народны касцюм. Я разглядвала іх колеры, узоры, крой і спрабавала вырашыць, які ж мне падабаецца больш... Шмат часу прайшло з той пары. Сёння калі і сустракаю каго ў народным, дык хіба што на фэсце этнамузыкі — хлопцаў у вышываных кашулях, якія прыбраліся так, каб прайсці бясплатна. Але аднойчы і мне самой пашчасціла весці канцэрт, апрануўшы аўтэнтычны мотальскі строй. Адчуванні былі найлепшыя: у летнюю спёку такая сукенка, што прыкрывае ўсе часткі цела, неверагодна лёгкая, і яе быццам на табе няма...

А нядаўна я даведалася, што намітка, якую насілі нашы прабабулі, — не проста галаўны ўбор. Гэта, аказваецца, сапраўдны ліфтынг! Каб правільна завязаць яе, патрэбна гадзіна. А зрабіўшы ўсё дасканала, адчуваеш, што скура на твары добра падцягнутая. Такі вось народны рэцэпт маладосці.

Дзяўчат у народных касцюмах сёння можна сустрэць на многіх мерапрыемствах. Яны падносяць хлеб-соль шаноўным гасцям. Прыгажуні, апранутыя ў сукенкі з вышытымі кветкамі, уручаюць падарункі ад імя кіраўніцтва краіны. Аднак дома, у маладых сем'ях, наўрад ці знойдзеш народныя строі. Нават тыя, якія можна было б атрымаць ад сваіх бабуль і дзядуляў, хутчэй за ўсё, так і ляжаць у кутах старых шаф і на гарышчах. Маладыя спадчыннікі могуць і не здагадвацца пра іх існаванне. Атрымліваецца, з надыходам XXI стагоддзя сваё, народнае, нам стала не патрэбна? Няўжо не мае яно ніякай каштоўнасці ў вачах сучасных беларусаў?..

Шмат разважала на гэтую тэму **дырэктар УП «Скарбніца» Марыя ТАРАЙКОВІЧ.** Не ўтойваючы эмоцый, яна падзялілася імі з карэспандэнтамі «Звязды»:

Правільна завязаная намітка — найлепшы ліфтынг для твару.

— Многія сёння кажуць: «А навошта нам захоўваць і адраджаць народныя промыслы? У нас усё механізаванае». Аднак я ўпэўнена, што людзям патрэбна энергетыка, якая зыходзіць не ад машыны, а ад чалавечых рук. Каб праз колькі гадоў нехта ўспомніў, што ёсць у нас, напрыклад, ткацтва — рамізнае, закладное, бранае, ажурнае, падвойнае... Промыслы ўвасабляюць нашу народнасць. І, калі ў грамадстве ніхто нічога пра іх не ведае, — гэта бяда.

Марыя Тарайковіч выступае супраць такога забыцця. «Скарбніца», якую яна ўзначальвае, з'яўляецца адзіным прадпрыемствам, што сумяшчае і навуковую дзейнасць, і вытворчасць. Яе супрацоўніцы кожны год выпраўляюцца ў этнаграфічныя экспедыцыі, даследуюць аўтэнтычныя ўзоры, тэхналогіі — дасканала вывучаюць, як рабіў народ. Толькі пасля гэтага на прадпрыемстве яны ствараюць мадэлі народнага адзення і самі вырабляюць іх.

Часам нічога прыдумваць увогуле не даводзіцца. Можна проста адшукаць рэч у вясковым куфэрку, дакладна паўтарыць, і яна будзе жаданай у гардэробе самай патрабавальнай модніцы.

Нядаўна з экспедыцыі прывезлі світку. Нават світкай яе назваць было складана: проста з'едзеная моллюануча, знойдзеная ў бабулі на гарышчы. Яе расклалі, распаролі. Дакладна па ўзору зрабілі лёгкае цёмна-зялёнае жаночае паліто (уніз ззаду на ім вузкія доўгія складкі, накшталт сучаснага плісэ, толькі цалкам зробленыя ўручную). І ўжо не адна жанчына замовіла яго сабе. Мадэль, якая пражыла, магчыма, не адно стагоддзе, аказалася дарэчы ў сучасным гардэробе. І гэта дакладная рэканструкцыя!

Мадэль світкі, якая пражыла не адно стагоддзе, аказалася дарэчы ў сучасным гардэробе.

Марыя Тарайковіч адзначае:

— Пабыўшы ў нацыянальным касцюме, ты робішся іншым. Уплывае энергетыка вышытых знакаў. Жанчына робіцца статнай. Ну проста каралева! Таму хацелася б, каб усе мы атрымлівалі кайф ад народных касцюмаў.

Ёсць некаторыя фірмы, якія замаўляюць у «Скарбніцы» народныя кашулі для сваіх супрацоўнікаў, — праўда, просяць вышыць на іх яшчэ і эмблему прадпрыемства. У такім выглядзе могуць пайсці, напрыклад, на карпаратыў. Аднак такіх свядомых прыхільнікаў народнай культуры зусім не шмат.

Раней, калі дзяўчаты ткалі сабе пасаг, яны пачыналі рабіць гэта ў 12 гадоў, каб да 18 усё было гатова. Бо і вышыўка, і ткацтва — надзвычай працаёмкі працэс. Нічога не змянілася і сёння (зразумела, калі адзенне робіцца рукамі). Напрыклад, мужчынскую кашулю трэба вышываць месяц. Магчыма, таму і не вельмі даступная яна шырокаму колу спажыўцоў.

Аднак міжволі ўзгадваецца ўкраінская сталіца. Усе цэнтральныя ўніверсмагі там запоўнены нацыянальным адзеннем, адаптаваным да сучаснасці. Людзі з задавальненнем ходзяць па вуліцах Кіева ў народных вышываннках.

Беларускія крамы не прапануюць нацыянальных кашуль на любы густ, якія можна было б насіць кожны дзень. З пакалення ў пакаленне любоў да свайго, адметнага у нас чамусьці амаль не перадаецца. Людзі не да канца ўсведамляюць, хто яны, проста не маючы на руках фактаў сваёй адметнасці. Але багатая традыцыя народнага касцюма ў гэтай справе магла б адыграць вельмі важную ролю:

У летнюю спёку мотальская сукенка неверагодна лёгкая, яе быццам на табе няма...

— Нацыянальная годнасць павінна перадавацца ў спадчыну ад бацькоў, — кажа дырэктар «Скарбніцы». — Я вельмі хацела б сказаць: «Людзі, прачніцеся!» Візітная картка любога народа — нацыянальны касцюм. Таму на ўсіх святах хацелася б бачыць людзей, апранутых па-народнаму...

Здаецца, надышоў час нарэшце звярнуць увагу на саміх сябе. Іначай многае мы беззваротна страцім. Забываючы пра нацыянальны касцюм, які вырабляўся толькі з прыродных матэрыялаў, сёння мы часта носім сінтэтычнае адзенне, якое зімой настывае, а летам пячэ, — магчыма, таму і хварэем часта. Адмаўляючыся ад глыбока сімвалічных узораў арнаменту, выбіраем малюнкі і колеры, якія нічога не значаць і ніяк не тлумачацца. Быць можа, замест таго, каб зноў апранацца ў штосьці шараговае, лепш хаця б час ад часу насіць рэчы, зробленыя з любоўю і мудрасцю?..

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ,
Фотаздымкі Марыны БЕГУНКОВАЙ

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

ООО «АРТЕС-СТРОЙИНВЕСТ» информирует юридических и физических лиц о **строительстве объекта:**
«Группа многоквартирных жилых домов по генплану №№ 11, 12, 13 в микрорайоне № 1 реконструируемой застройки в границах ул. Шаранговича, Горецкого, Рафиева (бывшая дер. Сухарево)» (без наружных инженерных сетей) (далее – Объект).

ЗАСТРОЙЩИК по Объекту – ООО «АРТЕС-СТРОЙИНВЕСТ» зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета от 15.05.2008 г., в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191024785. **Адрес**: 220035, г. Минск, ул. Гвардейская, д. 16, пом. 2Н, каб. 1, тел. 306-06-11. Режим работы: понедельник–пятница: с 09.00 до 17.30, выходные дни – суббота, воскресенье.

Застройщиком осуществлено строительство жилых домов по адресу: г. Минск, ул. В. Игнатовского, д. 8 (2009-2010 гг.).

Объект состоит из домов №№ 11, 13 (конструкции ОАО «МАПИД») и № 12 корпус 1, № 12 корпус 2 (конструкции ОАО «МДК»), по генплану в границах ул. Шаранговича, Горецкого, Рафиева (бывшая дер. Сухарево), инженерных сетей и инженерно-транспортной инфраструктуры. Первым этапом предусмотрено строительство жилого дома № 13 по генплану. Дома запроектированы с техническим подпольем и теплым чердаком, предусмотрено центральное отопление. Благоустройство дворовой территории: детская игровая площадка, места для отдыха взрослых, малые архитектурные формы.

К долевому строительству предлагается вторая очередь строительства Объекта жилой дом № 13 по генплану на 445 квартир состоящий из десяти подъездов 10-этажных секций серии КПД М464-У1.

Цель проекта строительства – исполнение решения Мингорисполкома «Об изъятии, предоставлении земельных участков, прекращении права частной собственности на земельный участок и разрешении строительства» № 336 от 14 февраля 2013 г.

Условия оплаты стоимости объекта долевого строительства:

Начало строительства объекта (ж/д № 13) – июнь 2013 года.

Окончание строительства объекта (ж/д № 13) – четвёртый квартал 2014 г.

Общая площадь квартир объекта (ж/д № 13) – 26 362,04 м² (445 квартир).

Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после ввода объекта в эксплуатацию: межквартирные лестничные клетки, лестницы, вентшахты, коридоры, крыши, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых домов и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания, поступают в общую собственность дольщиков.

Для заключения договоров долевого строительства с гражданами, не состоящими на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предоставляются в жилом доме № 13 по генплану следующие квартиры:

а) **5 (пять) однокомнатных** квартир по цене **13 000 000** (тринадцать миллионов) рублей 1 м² объекта долевого строительства с оплатой 100% стоимости объекта долевого строительства не позднее 7 (семи) банковских дней со дня регистрации договора;

б) **5 (пять) двухкомнатных** квартир по цене **12 950 000** (двенадцать миллионов девятьсот пятьдесят тысяч) рублей 1 м² объекта долевого строительства с оплатой **не менее 40%** стоимости объекта долевого строительства не позднее 7 (семи) банковских дней со дня регистрации договора. **При оплате 100%** стоимости объекта долевого строительства не позднее 7 (семи) банковских дней со дня регистрации договора цена объекта долевого строительства составит **12 500 000** (двенадцать миллионов пятьсот тысяч) рублей за 1 м²;

в) **10 (десять) трехкомнатных** квартир по цене **11 000 000** (одиннадцать миллионов) рублей 1 м² объекта долевого строительства с оплатой **не менее 40%** стоимости объекта долевого строительства не позднее 7 (семи) банковских дней со дня регистрации договора. При оплате **100% стоимости** объекта долевого строительства не позднее 7 (семи) банковских дней со дня регистрации договора цена объекта долевого строительства составит **10 500 000** (десять миллионов пятьсот тысяч) рублей за 1 м²;

г) **8 (восемь) трехкомнатных** квартир **на первом этаже** со строительными номерами №№ 1, 41, 91, 136, 172, 207, 257, 297 по цене **10 200 000** (десять миллионов двести тысяч) рублей 1 м² объекта долевого строительства с оплатой **не менее 40%** стоимости объекта долевого строительства не позднее 7 (семи) банковских дней со дня регистрации договора;

д) **6 (шесть) двухкомнатных** квартир **на первом этаже** со строительными номерами №№ 45, 94, 133, 171, 260, 300 по цене **11 000 000** (одиннадцать миллионов) рублей 1 м² объекта долевого строительства с оплатой **не менее 40%** стоимости объекта долевого строительства не позднее 7 (семи) банковских дней со дня регистрации договора;

е) **2 (две) однокомнатные** квартиры **на первом этаже** со строительными номерами №№ 396, 400 по цене **12 000 000** (двенадцать миллионов) рублей 1 м² объекта долевого строительства с оплатой **не менее 40%** стоимости объекта долевого строительства не позднее 7 (семи) банковских дней со дня регистрации договора.

Цена 1 м² объекта долевого строительства сформирована на 30.09.2013 г. и является фиксированной на указанную дату и дифференцированной в зависимости от количества комнат.

Квартиры передаются дольщикам без чистовой внутренней отделки.

Условия ознакомления дольщиков с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству: по согласованию с Застройщиком.

Застройщик имеет следующие разрешительные документы:

- разрешение на проведение проектно-изыскательских работ – Акты выбора размещения земельного участка, утвержденные председателем Мингорисполкома 27.04.2011 г. и 08.12.2011 г.;
- решение Минского городского исполнительного комитета от 14 февраля 2013 года № 336 о разрешении строительства объекта;
- свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельных участков:

временного пользования № 500000000006006946 площадью 1,2992 га;

постоянного пользования 500000000006006868 площадью 0,5571 га;

постоянного пользования 500000000006006869 площадью 0,0098 га;

постоянного пользования 500000000006006870 площадью 0,0081 га;

постоянного пользования 500000000006006871 площадью 0,0079 га;

- проектно-сметная документация, прошедшая государственную экспертизу (экспертное заключение, выданное РУП «Главгосстройэкспертиза» от 09.11.2012 г. № 995-15/12;
- договор строительного генподряда № 07-03/1 от 07.03.2013 г., заключенный с ОАО «МАПИД»;
- договор о долевом участии в финансировании проектирования и строительства инженерной и транспортной инфраструктуры № 11/И-2012 от 16.05.2012 г., заключенный с КУП «УКС администрации Фрунзенского района г. Минска»;
- выданное органом государственного строительного надзора разрешение на проведение строительно-монтажных работ от 04 июня 2013 г. № 2-208Ж-015/13.

Информацию об объекте долевого строительства, планировках квартир и условиях заключения договоров можно получить у Застройщика по телефону 8 (017) 3060611, или в риэлтерской организации ООО «ДИНАС» (сайт www.dinas.by, тел. 8 (017) 2339610).

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

«Строительство двух 19-этажных многоквартирных жилых домов со встроенными объектами торгово-общественного назначения в квартале улиц Ржавецкая – ул. Проектируемая № 1 – Проектируемая № 2 в жилом районе Лебяжий»

Застройщик: Общество с дополнительной ответственностью «Айрон», зарегистрировано Минским горисполкомом решением от 30 ноября 2000 г. № 1397 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100070331.

Юридический и почтовый адрес: Республики Беларусь, 220020, г. Минск, пр-т Победителей, д. 89, кор. 2, пом. 10, каб. 18, 41. **Тел.: 8 (017) 216 00 09, 8 (029)654 10 10, 8(029)708 46 64.**

Режим работы по вопросам долевого строительства: понедельник – пятница с 9.00 до 17.00, обед с 13.00 до 14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

В течение трех предшествующих лет ОДО «Айрон», как заказчиком строительства были построены следующие объекты:

в 2010 году

жилой дом № 11 по ул. Связистов в г. Минске;

в 2011 году:

жилой дом № 37А по ул. Бумажкова в г. Минске, жилой дом № 10 по ул. Нововиленская в г. Минске;

в 2012 году:

жилой дом № 31А по ул. Карвата в г. Минске;

в 2013 году:

жилой дом № 44 по ул. Янковского в г. Минске.

Информация о проекте строительства.

Цель строительства – исполнение условий договора № 89-Д от 23 февраля 2012 года, заключенного с Минским городским исполнительным комитетом на реализацию права проектирования и строительства двух 19-этажных многоквартирных домов со встроенными объектами торгово-общественного назначения в квартале ул. Ржавецкой – ул. Проектируемая № 1 – ул. Проектируемая № 2 в жилом районе Лебяжий.

Начало строительства – 3 квартал 2013 года, окончание строительства – 4 квартал 2014 года.

Застройщиком получены:

- заключение государственной экспертизы (РУП «Госстройэкспертиза») архитектурного проекта с рекомендацией к утверждению проекта № 503-60/12 от 21.08.2012 г.;
- решение Минского городского исполнительного комитета № 2426 от 03 августа 2012 года «Об изъятии, предоставлении земельных участков и разрешении строительства»;
- свидетельство (удостоверение) № 500/726-9995 о государственной регистрации на право временного пользования на земельный участок с кадастровым номером 500000000007006166, расположенный по адресу: г. Минск, квартал улиц Ржавецкая – ул. Проектируемая № 1 – Проектируемая № 2 в жилом районе Лебяжий, площадью 0,9303 га для строительства объекта «Строительство двух 19-этажных многоквартирных жилых домов со встроенными объектами торгово-общественного назначения в квартале улиц Ржавецкая – ул. Проектируемая № 1 – Проектируемая № 2 в жилом районе Лебяжий»;
- разрешение на производство строительно-монтажных работ Инспекции Департамента по надзору и контролю за строительством по г. Минску № 2-209Ж-050/12 от 27.12.2012 г.

Генеральный подрядчик ООО «ДомСтройАгент». Договор строительного подряда №-60-10-2012-Л от 19.10.2012 г.

Проектом предусматривается размещение на площадке в квартале улиц Ржавецкая – Проектируемая № 1 – Проектируемая № 2 двух 20-этажных 144-квартирных жилых домов № 1 и № 2 по генплану, открытых автомобильных парковок общей вместимостью 149 машино-мест с местами для машин маломобильных групп населения, двух детских площадок, двух площадок для отдыха. Проектом предусмотрено строительство объекта в 2 этапа: 1 этап: жилой дом № 2 по генплану и наружные инженерные сети к нему; 2 этап: жилой дом № 1 по генплану и наружные инженерные сети к нему. В подвале и на 1 этаже расположены встроенные помещения общественного назначения, помещение кондоминимума. Конструктивная схема здания – монолитный железобетонный каркас с наружными стенами из блоков ячеистого бетона. Наружная отделка – декоративная рельефная штукатурка с покраской фасадными красками, облицовка плиткой из вибропрессованного бетона. Оконные блоки стеклопакеты ПВХ, лоджии и балконы остеклены. Планировки квартир выполнены с учетом принципов функционального зонирования, внутренняя отделка квартир – подготовка под финишную отделку. Секция оборудована двумя лифтами, мусоропроводом.

